ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
_____2025 №

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Беларуская літаратура»
для V–IX класаў устаноў адукацыі,
якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі,
з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» (далей – вучэбная праграма) прызначана для вывучэння вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура» ў V–IX класах устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана:

на V клас – 70 вучэбных гадзін (2 гадзіны на тыдзень);

VI клас – 70 вучэбных гадзін (2 гадзіны на тыдзень);

VII клас – 53 вучэбныя гадзіны (у першым паўгоддзі навучальнага года – 1, у другім паўгоддзі – 2 гадзіны на тыдзень);

VIII клас – 53 вучэбныя гадзіны (у першым паўгоддзі навучальнага года – 2, у другім паўгоддзі – 1 гадзіна на тыдзень);

IX клас – 51 вучэбная гадзіна (у першым паўгоддзі навучальнага года – 1, у другім паўгоддзі – 2 гадзіны на тыдзень).

3. Мэта вывучэння вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура» – далучэнне вучняў да мастацтва слова ў кантэксце духоўнага і сацыяльна-гістарычнага жыцця народа і фарміраванне на гэтай аснове мастацкага мыслення, эстэтычных пачуццяў, чытацкай і маўленчай культуры, выхаванне чалавека з глыбокім гуманістычным і дэмакратычным светапоглядам, развітым пачуццём нацыянальнай і асабістай самапавагі, патрыёта, адданага агульначалавечым ідэалам, асобы з выразна выяўленымі творчымі схільнасцямі, здольнай успрыманне прыгожага выкарыстаць для выпрацоўкі стымулу маральнага, інтэлектуальнага і духоўнага развіцця.

4. Задачы вывучэння вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура»:

фарміраванне здольнасці разумець і эстэтычна ўспрымаць мастацкія творы;

узбагачэнне духоўнага вопыту вучняў шляхам далучэння іх да маральных каштоўнасцей, закладзеных у творах беларускай літаратуры;

фарміраванне ўменняў аналізаваць мастацкія творы, вызначаць у іх тэмы, праблемы, ідэі;

развіццё і ўдасканаленне вуснага і пісьмовага маўлення.

5. Рэкамендаваныя метады і прыёмы навучання і выхавання павінны быць накіраваны на вучня як цэнтральную фігуру адукацыйнага працэсу, стымуляванне яго вучэбнай дзейнасці, развіццё самастойнасці ў навучанні. Могуць быць выкарыстаны наступныя формы правядзення заняткаў: франтальная, індывідуальная, групавая, парная. У працэсе выкладання вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура» выкарыстоўваюцца разнастайныя метады і прыёмы: выразнае чытанне, вуснае славеснае

маляванне, розныя віды пераказу, аналіз эпізодаў, розныя віды каментарыяў, эксплікацыя, мастацкая інтэрпрэтацыя, творчыя міні-праекты, іншыя метады і прыёмы.

Выбар форм, метадаў і прыёмаў навучання і выхавання вызначаецца педагагічным работнікам самастойна на аснове мэт і задач вывучэння пэўнай тэмы, сфармуляваных у дадзенай вучэбнай праграме патрабаванняў да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў з улікам іх узроставых і індывідуальных асаблівасцей.

Асноўныя віды дзейнасці: аргументаванне ўласных ацэнак дзеянняў і ўчынкаў герояў і падзей; беглае чытанне мастацкіх, навукова-папулярных і публіцыстычных тэкстаў; характарыстыка (індывідуальная, параўнальная, групавая) герояў твора; складанне плана ўласнага выказвання; напісанне сачыненняў розных відаў па вывучаных творах; разгорнуты адказ на пытанне з элементамі характарыстыкі літаратурнага героя, адказ на праблемнае пытанне; вуснае слоўнае маляванне; напісанне водгуку на самастойна прачытаны літаратурны твор, твор выяўленчага мастацтва, кінафільм або тэлеперадачу; пераказ (выбарачны, падрабязны, творчы) эпічнага твора ці ўрыўка з яго; выкананне творчых заданняў; выразнае чытанне мастацкіх твораў розных жанраў; даклад, паведамленне, рэферат на літаратурную тэму па адной ці некалькіх крыніцах; каменціраванне мастацкага тэксту; мастацкае расказванне; назіранне за мовай і асаблівасцямі будовы мастацкага твора; напісанне ўласных твораў (вершаў, казак, загадак, невялікіх апавяданняў, мастацкіх замалёвак, эсэ і падобных твораў); падрыхтоўка вуснага выказвання; складанне вусных замалёвак, уласных казак, загадак; складанне плана (у тым ліку цытатнага) твора ці ўрыўка з яго; стварэнне ілюстрацый да літаратурнага твора і іх прэзентацыя; супастаўленне літаратурнага твора з яго інтэрпрэтацыяй у іншых відах мастацтва; супастаўленне мастацкіх твораў розных аўтараў; устанаўленне асацыятыўных сувязей літаратурнага твора з творамі іншых відаў мастацтва; чытанне і паўнавартаснае ўспрыманне мастацкіх твораў; чытанне па асобах, інсцэніраванне і мізансцэніраванне эпізодаў з літаратурных твораў.

Са спіса твораў, прапанаваных для дадатковага чытання, педагагічны работнік выбірае тыя, выкарыстанне якіх ён лічыць найбольш дарэчным у пэўным класным калектыве, улічваючы індывідуальныя магчымасці вучняў і наяўнасць тэкстаў у бібліятэчным фондзе.

Разгляд твораў рубрыкі «Мастацтва», якія выкарыстоўваюцца ў якасці ілюстрацыйнага матэрыялу, адбываецца з улікам выбару педагагічнага работніка. Дадатковыя гадзіны для знаёмства з такімі творамі дадзенай вучэбнай праграмай не прадугледжаны.

Асобных урокаў на вывучэнне тэорыі літаратуры не адводзіцца. Праца па фарміраванні тэарэтычных паняццяў павінна праводзіцца ва

ўзаемасувязі з вывучэннем канкрэтных мастацкіх твораў.

Гадзіны, адведзеныя на творчыя работы, у тым ліку на навучальныя і кантрольныя сачыненні, педагагічны работнік размяркоўвае ў адпаведнасці з каляндарна-тэматычным планаваннем.

6. Вынікам дасягнення мэт і задач літаратурнай адукацыі становяцца прадметныя кампетэнцыі: літаратурная, каштоўнасна-светапоглядная, маўленчая, камунікатыўная, культуралагічная і культуратворчая.

Вынікам фарміравання літаратурнай кампетэнцыі з'яўляецца засваенне вучнямі ведаў пра літаратуру як сістэму, сфарміраваных у выглядзе паняццяў і рэалізаваных у разнастайных спосабах дзейнасці.

Вынікам фарміравання каштоўнасна-светапогляднай кампетэнцыі павінна стаць агульная сістэма духоўна-маральных каштоўнасных арыентацый, нацыянальна-культурнай самаідэнтыфікацыі, гуманістычнага погляду на свет, павага вучняў да агульначалавечых каштоўнасцей.

Вынікам фарміравання маўленчай і камунікатыўнай кампетэнцый павінна стаць паспяховае ажыццяўленне вучнем маўленча-камунікатыўнай дзейнасці, калі вучань з'яўляецца суб'ектам дзейнасці і зносін.

Вынікам фарміравання ў вучняў культуралагічнай кампетэнцыі павінна стаць усведамленне вучнямі літаратуры як феномена культуры, асэнсаванне імі нацыянальна-культурнай спецыфікі беларускай літаратуры ў адзінстве з сусветнай мастацкай культурай.

Вынікам рэалізацыі культуратворчай кампетэнцыі ў навучанні літаратуры з'яўляецца авалоданне не асобнымі базавымі ведамі, літаратурна-творчымі ўменнямі і навыкамі, а сістэмай цэласных аперацыянальных комплексаў розных відаў творчай дзейнасці, гэта значыць, навучанне ў дзейнасці праз уключэнне ў гэту дзейнасць.

Асобасныя вынікі засваення зместу адукацыйнай праграмы па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» адлюстроўваюць асаблівасці развіцця асобы вучня і выяўляюцца ў тым, што вучань: прымае і кіруецца маральнымі каштоўнасцямі; усведамляе сябе грамадзянінам беларускай дзяржавы і грамадства, ведае сваю этнічную прыналежнасць; успрымае сям'ю як асабістую каштоўнасць; дэманструе ўстойлівую цікавасць да самастойнай дзейнасці, самаразвіцця, самапазнання; праяўляе павагу да нацыянальнай культурнай спадчыны; праяўляе міжэтнічную і міжкультурную талерантнасць, павагу да чужога меркавання; здольны да эстэтычнага ўспрымання навакольнага свету.

Метапрадметныя вынікі засваення зместу адукацыйнай праграмы па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» адлюстроўваюць гатоўнасць вучня да вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, засваенне ўніверсальных вучэбных дзеянняў і міжпрадметных паняццяў і выяўляюцца ў тым, што вучань: мае сфармаваныя агульнанавучальныя ўменні і навыкі, якія забяспечваюць здольнасць да самастойнага засваення новых, уключаючы і

арганізацыю гэтага працэсу, да эфектыўнага рашэння рознага роду жыццёвых задач, на аснове якіх фарміруюцца і развіваюцца яго кампетэнцыі; ажыццяўляе разумовую дзейнасць на адпаведным узроставым асаблівасцям узроўні: умее аналізаваць і сінтэзаваць, аперыраваць паняццямі, рабіць абагульненні, устанаўліваць аналогіі і прычынна-выніковыя сувязі, класіфікаваць, канструяваць лагічную выснову і рабіць вывады; валодае прадметнымі ведамі, якія адлюстроўваюць сутнасныя сувязі і адносіны паміж аб’ектамі і працэсамі рэчаіснасці; умее арганізоўваць пазнавальную дзейнасць; наладжвае супрацоўніцтва і прымае ўдзел у розных відах вучэбна-пазнавальнай дзейнасці; здольны пісьменна і аргументавана выкладаць свае думкі пісьмова і вусна; адстойвае і абгрунтоўвае свой пункт гледжання; мае навыкі ўсвядомленага чытання тэкстаў розных стыляў і жанраў; умее выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі ў вучэбна-пазнавальных мэтах, вылучаць галоўнае, істотныя прыкметы паняццяў, працаваць з тэкставай і графічнай інфармацыяй; крытычна ацэньвае і інтэрпрэтуе інфармацыю з розных крыніц; праяўляе здольнасць і гатоўнасць да самастойнай творчай дзейнасці; прытрымліваецца этычных і маральных норм зносін і супрацоўніцтва; умее выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі ў вучэбна-пазнавальных мэтах, вылучаць галоўнае, істотныя прыкметы паняццяў, працаваць з тэкставай і графічнай інфармацыяй; праяўляе цікавасць да вучэбна-даследчай і праектнай дзейнасці, здольнасць і гатоўнасць да самастойнай творчай дзейнасці.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

### V клас

Усяго 70 гадзін:
на вывучэнне твораў – 63 гадзіны;
на навучальныя сачыненні – 2 гадзіны;
на ўрокі па творах для дадатковага чытання – 4 гадзіны;
рэзерв вучэбнага часу – 1 гадзіна.

### УВОДЗІНЫ (1 гадзіна)

Тэматычная, змястоўная разнастайнасць фальклорных і літаратурных твораў. Пазнавальнае і эстэтычнае значэнне літаратуры.

### РОДНАЕ СЛОВА (4 гадзіны)

Пятрусь Броўка. «Калі ласка». Родная мова – крыніца натхнення пісьменніка. Эмацыянальнасць выказвання. Мастацкая дасканаласць паэтычных вобразаў, інтанацыйнае багацце верша. Раскрыццё характару беларуса. Заклапочанасць паэта лёсам роднай мовы.

Яўгенія Янішчыц. «Мова». Замілаванне аўтара выразнасцю і прыгажосцю беларускага слова. Роздум пра няпросты лёс беларускай мовы на працягу шматгадовай гісторыі народа. Спавядальны характар верша. Эмацыянальная выразнасць паэтычных радкоў. Дасканаласць сродкаў мастацкага выяўлення, адметная роля эпітэтаў у стварэнні мастацкіх вобразаў верша.

Анатоль Грачанікаў. «Дрымотна ціснуцца кусты...». Паэтызацыя роднай прыроды ў творы. Выяўленне трывогі, душэўнага ўзрушэння паэта на фоне гарманічнага быцця прыроды. Роля аўтарскага звароту да роднага краю. Своеасаблівасць будовы і адметнасць мовы твора.

Уладзімір Караткевіч. «Бацькаўшчына». Гонар за сваю радзіму, захапленне яе краявідамі. Мастацкае адлюстраванне прыроднага наваколля ў вершы. Глыбокі лірызм, шчырасць і непасрэднасць у перадачы пачуццяў паэта. Вобразнасць, эмацыянальная насычанасць мовы.

Мастацтва. Жывапіс: В.Цвірка. «Мая Радзіма», «Заслаўе»; М.Ісаёнак. «Песня аб маёй зямлі»; І.Пушкоў. «Вясна на Нёмане»; А.Казлоўскі. «Зялёны май»; М.Рагалевіч. «Сімфонія вясны»; В.Бялыніцкі-Біруля. «Лотаць зацвіла»; В.Бяляўскі. «Беларускі краявід» і іншыя творы.

## ВУСНАЯ НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ (13 гадзін)

### Народныя казкі

«Разумная дачка». Займальнасць казачнага сюжэта. Выяўленне народнай кемлівасці, дасціпнасці, спрыту і розуму ў вобразе дачкі бедняка. Вобразы мужыка, пана, багацея і яго жонкі. Індывідуалізацыя мовы персанажаў. Дыялог як сродак характарыстыкі пана і дзяўчынкі. Роля фантазіі і выдумкі, характар канфлікту, адметнасці вобразнай сістэмы бытавой казкі. Гумар у творы.

«Залаты птах». Сцвярджэнне высокіх маральных каштоўнасцей: працавітасці, смеласці, дабрыні і спагадлівасці. Супрацьстаянне дабра і зла як пастаянны матыў народнай казкі. Вобраз галоўнага героя. Мастацкая гіпербала як сродак характарыстыкі персанажа.

«Музы́кі». Характарыстыка казачных герояў – асла, сабакі, ката і пеўня. Сіла адданага, вернага сяброўства ў пераадоленні жыццёвых нягод. Займальнасць казачнага сюжэта. Адметнасць казкі пра жывёл.

## Легенды

«Нарач». Гісторыя паходжання возера. Еднасць чалавека і прыроды. Фантастычнае і чароўнае ў легендзе аб Найрыце. Паэтызацыя прыгажосці, душэўнай чысціні, вернасці ў каханні. Маральная перавага Найрыты над панам. Лаканічнасць і мастацкая выразнасць мовы.

«Пестунь». Мастацкая выразнасць легенды, багацце бытавых і сацыяльных рэалій, даступнасць зместу і лаканізм формы. Спосабы абмалёўкі вобразаў. Павучальны змест твора.

Мастацтва. Беларускія легенды, казкі ў творах мастакоў А.Александровіча, А.Навіцкага, Ю.Зайцава, В.Валынца, У.Гладкевіча і іншых творцаў; мультфільмы, тэатральныя, тэле- і радыёспектаклі па легендах, казках.

## Загадкі

Паэтычнае асэнсаванне свету ў загадках. Дасціпнасць і мудрасць беларускіх загадак, іх тэматычнае багацце. Роля загадкі ў выхаванні кемлівасці, знаходлівасці. Будова, іншасказальны характар, лаканізм загадак.

## Прыказкі

Увасабленне ў прыказках вопыту і мудрасці народа. Разнастайнасць тэматыкі, сцісласць і выразнасць, пераносны сэнс прыказак. Лаканізм, трапнасць і дакладнасць мовы. Прыказкі як своеасаблівыя мастацкія творы.

## Прыкметы і павер'і

Спасціжэнне чалавекам навакольнага свету і ўсведамленне свайго месца ў ім. Функцыі прыкмет і павер'яў, іх скіраванасць на паляпшэнне дабрабыту працоўнага чалавека. Афарыстычнасць, трапнасць народных прыкмет. Блізкасць прыкмет і павер'яў да іншых фальклорных жанраў (загадак, казак, легенд, прыказак).

Тэорыя літаратуры. Народная казка. Віды казак (пра жывёл, чарадзейныя, бытавыя). Легенды, іх асаблівасці. Загадкі. Прыказкі. Прыкметы і павер'і.

## ЛІТАРАТУРНЫЯ КАЗКІ І ЛЕГЕНДЫ (10 гадзін)

Максім Танк. «Ля вогнішч начлежных» (урывак з паэмы «Нарач»). Мастацкае пераасэнсаванне легенды пра ўтварэнне возера Нарач.

Выкарыстанне ў творы фальклорных матываў і сюжэтаў. Паэтызацыя вернасці і кахання. Вобразы Галі і Васіля. Драматызм і напружанасць сюжэта. Сродкі мастацкай выразнасці ў творы.

Якуб Колас. «Крыніца». Алегарычны змест і патрыятычны пафас казкі. Характарыстыка крыніцы праз яе адносіны да родных мясцін. Усведамленне гарой сваёй адказнасці перад будучыняй. Аўтар-апавядальнік у творы. Сувязь паэтыкі казкі з вуснай народнай творчасцю.

Уладзімір Караткевіч. «Нямоглы бацька». Фальклорная аснова твора. Гуманістычны пафас казкі. Шанаванне мудрасці і вопыту бацькоў, выхаванне ўдзячнасці, павагі, уважлівасці і міласэрнасці да іх. Адносіны аўтара да герояў і падзей.

Андрэй Федарэнка. «Падслуханая казка». Аўтарская інтэрпрэтацыя паходжання кветак-маргарытак у розных краінах Еўропы. Індывідуалізацыя казачных персанажаў. Своеасаблівасць будовы і адметнасць мовы літаратурнай казкі.

Тэорыя літаратуры. Літаратурная казка. Легенда ў літаратуры.

## ВЫРАЗНАСЦЬ МАСТАЦКАГА СЛОВА (8 гадзін)

Максім Багдановіч. «Зімой». Паэтычны малюнак зімовага вечара. Непасрэднасць, вастрыня паэтычнага светаўспрымання. Фальклорна-рамантычны каларыт карцін прыроды, іх эмацыянальная выразнасць. Вобразна-выяўленчыя сродкі. Гукавая інструментоўка верша.

Анатоль Грачанікаў. «Зоры спяваюць». Паэтызацыя зорнага неба, зачараванасць яго прыгажосцю і гармоніяй. Філасофскі роздум пра бясконцасць сусвету, шчасце яго сузірання і пазнання. Сціслаць і эмацыянальнасць выказвання, выразнасць і пластычнасць мовы.

Якуб Колас. «Песня ляснога жаваранка» (урывак з трылогіі «На ростанях»). Майстэрства пісьменніка ў перадачы колеравай і гукавой гамы навакольнага свету. Замілаванасць хараством прыроды і захапленне цудоўнай песняй ляснога жаваранка, перададзеныя праз арыгінальныя эпітэты, метафары, параўнанні. Вобразнасць, выразнасць і пластычнасць мовы.

Якуб Колас. «На рэчцы» (урывак з паэмы «Новая зямля»). Паэтызацыя зімовага пейзажу. Выяўленне паўнаты і радасці жыцця праз вобразны і інтанацыйны лад верша. Адухоўленасць карціны прыроды. Мастацкая выразнасць мовы.

Уладзімір Караткевіч. «Лісце». Майстэрства аўтара ў стварэнні вобраза восені, тонкасць паэтычнага светаадчування. Паэтычная адухоўленасць з'яў прыроды. Захапленне хараством восені, перададзенае праз шматлікія тропы, напеўны рытм верша.

Анатоль Грачанікаў. «Верасень». Суладнасць пачуццяў лірычнага

героя верша і прыроды, адчуванне духоўнага адзінства з зямлёй. Эмацыянальная пранікнёнасць, цеплыня, задушэўнасць выказвання, даверлівасць інтанацый.

Пятрусь Броўка. «Кропля». Адлюстраванне зменлівасці прыроды падчас навальніцы. Багацце зрокавых малюнкаў. Паэтычны сэнс вобразна-выяўленчых сродкаў і рытмічнай арганізацыі верша.

Тэорыя літаратуры. Сродкі мастацкай выразнасці ў літаратурным творы. Эпітэт, параўнанне (пачатковае паняцце).

Мастацтва. Жывапіс: В.Бялыніцкі-Біруля. «Восень», «Лес задрамаў», «Аголеныя бярозкі»; В.Ціханаў. «Восеньскі матыў»; У.Сулкоўскі. «Бервянец. Восень»; А.Бараноўскі. «Восень на Прыпяці»; Ф.Рушчыц. «Зімовая казка»; В.Цвірка. «Беларускі пейзаж» і іншыя творы.

## ЛІТАРАТУРНЫ ТВОР – СКЛАДАНАЕ І НЕПАДЗЕЛЬНАЕ МАСТАЦКАЕ АДЗІНСТВА (22 гадзіны)

Якуб Колас. «Дарэктар» (урывак з паэмы «Новая зямля»). Паэтычнае асэнсаванне штодзённага жыцця сялянскіх дзяцей. Прырода і дзеці, іх дапытлівасць, назіральнасць. Аўтарскі гумар у паказе паводзін хлопчыкаў. Рытмічны малюнак, вобразна-выяўленчыя сродкі (адмоўныя паралелізмы, эпітэты, параўнанні).

Якуб Колас. «У старых дубах». Сяброўства Грышкі і Базыля. Неабдуманы ўчынак Грышкі. Майстэрства пісьменніка ў раскрыцці ўнутранага свету дзяцей. Роля малюнкаў прыроды ў творы.

Міхась Лынькоў. «Васількі». Трагедыя Міколкі і яго родных. Аўтарскі боль па загубленым маленстве. Кантраснасць і эмацыянальная сугучнасць карцін прыроды і настрою хлопчыка. Прыёмы абмалёўкі характараў Міколкі і дзеда Нупрэя. Драматызм, напружанасць сюжэта. Роля заключнага эпізоду ў раскрыцці тэмы. Пейзаж у творы. Лірычнасць апавядання.

Васіль Зуёнак. «Прыйдзі аднойчы...». Паэтычны зварот загінуўшага бацькі да сына як наказ наступнаму пакаленню. Роля параўнанняў і рытміка-інтанацыйнага ладу верша ў выяўленні мастацкай ідэі. Спалучэнне ў творы глыбокага лірызму з патрыятычным пафасам.

Анатоль Кудравец. «Цітаўкі». Маральна-этычныя праблемы ў творы. Узаемаадносіны дзяцей з вартаўніком Агеем. Прыёмы псіхалагічнай абмалёўкі характараў. Уплыў дзеда Агея на маральнае сталенне Кастуся. Сюжэт апавядання.

Генрых Далідовіч. «Страта». Рэальна-жыццёвая аснова апавядання. Трагічны лёс Міці Бокуця. Чуласць, міласэрнасць, спачуванне Стасіка ў адносінах да хворага сябра. Майстэрства пісьменніка ў абмалёўцы характараў хлопчыкаў, псіхалагізм у раскрыцці перажыванняў Стасіка.

Адметнасць будовы апавядання. Аўтар-апавядальнік у творы.

Максім Лужанін. «Добры хлопец Дзік». Рэальная жыццёвая аснова твора. Гісторыя Дзіка. Майстэрства пісьменніка ў стварэнні вобраза сабакі, узаемаадносіны Дзіка з Гаспадаром, іншымі персанажамі аповесці. Сродкі раскрыцця характараў герояў твора. Асоба аўтара-апавядальніка. Адметнасць будовы аповесці.

Уладзімір Караткевіч. «Былі ў мяне мядзведзі». Выяўленне духоўнай шчодрасці чалавека ў клопатах аб прыродзе. Гісторыя Бурыка, яе значэнне ў раскрыцці ідэі апавядання. Паяднанасць жыцця людзей з жыццём прыроды. Пластычнасць вобразаў. Асоба аўтара-апавядальніка ў творы.

Тэорыя літаратуры. Тэма мастацкага твора. Сюжэт. Эпізод у творы. Літаратурны герой. Сродкі яго паказу – перажыванні, учынкі, партрэт, мова, мастацкія дэталі, пейзаж, аўтарская характарыстыка (пачатковыя паняцці).

Мастацтва. Жывапіс: У.Зінкевіч. «Шчасце мірнага дня»; С.Гарачаў. «Дзяцінства»; М.Селяшчук. «А раптам гэта ўзнікне перад табой?»; М.Савіцкі. «Дзеці вайны», «Партызаны. Блакада» і іншыя творы.

## ПРЫГОДЫ І ПАДАРОЖЖЫ (4 гадзіны)

Міхась Лынькоў. «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў». Прыгодніцкі характар аповесці. Займальнасць сюжэта. Роля гумарыстычных элементаў у выяўленні аўтарскіх адносін да байцоў і Мішкі, Жука, Барадатага. Кампазіцыя аповесці.

Паўтарэнне і падагульненне вывучанага за год (1 гадзіна).

## Спіс твораў для завучвання на памяць і мастацкага расказвання

Пятрусь Броўка. «Калі ласка».

Максім Багдановіч. «Зімой».

Якуб Колас. «Дарэктар» (з паэмы «Новая зямля») – пачатак (апісанне восені).

Міхась Лынькоў. «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў» (пачатак раздзела «Як Мішка трапіў на вайсковую службу» і да слоў «І пах ад іх ішоў далёка-далёка, праз лес, праз балота, да самае лесавое дарогі»).

## Спіс твораў для дадатковага чытання

Беларускія народныя казкі.

Янка Брыль. «Цюцік».

Эдуард Валасевіч. «Дняпроўскі чарадзей».

Уладзімір Дубоўка. «Як сінячок да сонца лётаў».

Міхась Зарэмба. «Арэхавы Спас».
Уладзімір Караткевіч. «Кацёл з каменьчыкамі».
Астрыд Ліндгрэн. «Браты Львінае Сэрца».
Міхась Лынькоў. «Міколка-паравоз».
Георгій Марчук. «Чужое багацце».
Алена Масла. «Таямніца закінутай хаты».
Эрых Распэ. «Прыгоды барона Мюнхаўзена».
Пятро Сіняўскі. «Зачараваная гаспадарка».
Алесь Якімовіч. «Рыжык».

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў V класа

Ведаць:
аўтараў, назвы і змест вывучаных твораў;
адметныя жанравыя ўласцівасці народных і літаратурных легенд, казак, загадак, прыказак, прыкмет, павер’яў;
выяўленчыя сродкі мастацкай выразнасці мовы;
звесткі па тэорыі літаратуры, неабходныя для аналізу мастацкага твора;
творы для завучвання на памяць;
умець:
выразна, у патрэбным тэмпе чытаць уголас літаратурныя творы, выяўляючы аўтарскую пазіцыю і свае адносіны да адлюстраванага;
узнаўляць мастацкія карціны, створаныя пісьменнікам;
самастойна дзяліць твор на часткі;
складаць план невялікага апавядальнага твора ці ўрыўка з яго;
сцісла, выбарачна або падрабязна вусна пераказваць невялікі апавядальны твор ці ўрывак з яго;
вылучаць эпізоды ці дэталі, важныя для характарыстыкі дзейных асоб; знаходзіць сувязь паміж падзеямі ў вывучаным творы;
знаходзіць выяўленчыя сродкі мовы і з дапамогай педагагічнага работніка вызначаць іх ролю ў стварэнні вобраза, раскрыцці тэмы твора;
характарызаваць героя мастацкага твора па яго ўчынках, паводзінах, перажываннях;
рыхтаваць сачыненні з элементамі апісання і разважання (разгорнуты адказ, адказ на пытанне і паведамленне пра героя), апісваць свае назіранні і ўражанні ад падзей і з’яў жыцця;
даваць водгук на самастойна прачытаны літаратурны твор і на творы іншых відаў мастацтва, выказваючы свае адносіны да герояў і падзей;
карыстацца даведачным апаратам вучэбнага дапаможніка;
даваць разгорнуты адказ на пытанне, ставіць пытанні да літаратурнага тэксту;
валодаць:

навыкамі выяўлення адметных рыс характару герояў, тыповага ў іх паводзінах, стаўленні да жыцця;

уменнямі і навыкамі вуснага і пісьмовага маўлення, лагічнага выказвання думак, дастатковым запасам маўленчых сродкаў;

навыкамі параўнання літаратурных твораў з творамі жывапісу, музыкі і іншых відаў мастацтва;

рознымі відамі літаратурна-творчай дзейнасці (напісанне сачынення, складанне паведамлення);

навыкамі работы з даведачнай літаратурай па пэўнай тэме (слоўнікі, даведнікі, энцыклапедыі, інтэрнэт-рэсурсы).

## VI клас

Усяго 70 гадзін:
на вывучэнне твораў – 62 гадзіны;
на навучальныя сачыненні – 2 гадзіны;
на ўрокі па творах для дадатковага чытання – 4 гадзіны;
рэзерв вучэбнага часу – 2 гадзіны.

### УВОДЗІНЫ. КНІГА АДКРЫВАЕ СВЕТ (1 гадзіна)

Літаратура як від мастацтва. Месца і роля кнігі ў развіцці грамадства. Узаемасувязь вуснай народнай творчасці і мастацкай літаратуры. Адлюстраванне ў літаратуры мінулага і сучаснага.

### РОДНАЯ ЗЯМЛЯ. МОЙ РОД. НАРОД (6 гадзін)

Пятрусь Броўка. «Прысяга сэрцам». Аўтарскае ўспрыманне бацькоўскага краю і выяўленне пачуцця ўдзячнасці лірычным героем верша. Патрыятычны пафас твора. Роля назвы верша ў разуменні яго ідэі.

Алесь Казека. «Я – маленькая кропля з крыніцаў святых». Усведамленне лірычным героем сваёй прыналежнасці да беларускага народа. Эмацыянальная насычанасць выказвання, метафарычнасць мовы.

Уладзімір Ліпскі. «Ад роду – да народу» (з кнігі «Я»). Радавод – гісторыя сям’і і роду, якая расказвае пра паходжанне чалавека, пераемнасць пакаленняў. Уяўленне пра радаводнае дрэва. Гісторыя краіны ў лёсе кожнай сям’і. Памяць аб продках – аснова годнай будучыні беларускага народа.

Алесь Пісьмянкоў. «Продкі». Услаўленне паэтам моцы, мужнасці і працавітасці продкаў, іх песеннай душы. Асноўная думка твора: памяць пра радаводныя карані, вопыт папярэднікаў – духоўны грунт чалавека і крыніца яго аптымістычнай веры ў будучыню. Эмацыянальнасць мовы.

Уладзімір Караткевіч. «Лебядзіны скіт». Легенда пра паходжанне назвы «Белая Русь». Сутыкненне дабра і зла ў аснове сюжэтнага дзеяння. Увасабленне ў вобразе старца лепшых чалавечых якасцей: адданасці свайму народу, гатоўнасці прыняць смерць дзеля яго выратавання. Маральная перамога старца над Батыем. Роля вобраза Юсуфі ў раскрыцці ідэі. Патрыятычнае гучанне твора.

Мастацтва. Жывапіс: «Мая зямля: жывапіс беларускіх мастакоў»: альбом. Фотамастацтва: Г.Ліхтаровіч. «Добры дзень, Беларусь»: альбом.

## ФАЛЬКЛОР І ЛІТАРАТУРА (15 гадзін)

### Міфы

Асаблівасці вуснага мастацкага слова. Паэтычнае асэнсаванне жыцця ў народнай творчасці. Беларускія міфы і паданні пра Сварога, Перуна, Дажбога, Ярылу, Жыжаля, Вялеса, вадзянікоў, лесавікоў, дамавікоў, ваўкалакаў, ліхаманак і іншых міфічных істот. Міфы як этап развіцця культуры народа. Пераход міфалагічных вобразаў і матываў у павер’і, легенды, літаратурныя творы.

«Дамавікова ўдзячнасць». Адлюстраванне ў легендзе язычніцкіх уяўленняў нашых продкаў пра гарманічнае ўладкаванне свету. Напружанасць і дынамізм сюжэта, адметнасць вобразаў. Жыццёвая мудрасць гаспадара, непасрэднасць і легкадумнасць дзяцей, удзячнасць і спагадлівасць вужа-дамавіка, агрэсіўнасць і помслівасць гадзюкі.

Ян Баршчэўскі. «Вужыная карона». Міфалагічная аснова твора. Узаемасувязь і ўзаемазалежнасць чалавека і прыроды. Лёс лоўчага Сямёна. Фантастычнае і чароўнае ў апавяданні.

Максім Багдановіч. «Вадзянік». Паэтычнае апісанне вадзяніка як аднаго з герояў міфалогіі. Адухоўленасць паэтычнага светаўспрымання, меладычнасць гучання твора. Жывапіснасць вобразаў і карцін прыроды.

Казімір Камейша. «Камень ля вёскі Камень». Міфалагічная аснова твора. Эмацыянальна-патэтычная легенда пра паходжанне каменя-валуна. Займальнасць сюжэта, разнастайнасць вобразаў. Адметнасць будовы і мовы верша.

Якуб Колас. «Жывая вада». Сувязь апавядання з народнай казкай. Алегарычна-філасофскі змест твора, яго патрыятычны пафас. Адказнасць кожнага чалавека за лёс роднай зямлі як асноўная ўмова ўласнага дабрабыту і шчасця. Вобразная сістэма апавядання. Роля пейзажу ў раскрыцці асноўнай думкі твора.

Беларуская песня

«Прыехала Каляда на белым кані...», «Вы, калядачкі, бліны-ладачкі...», «Благаславі, маці, вясну заклікаці...», «А на Купалу рана сонца іграла...». Увасабленне ў народных песнях мар і спадзяванняў народа, паэтызацыя яго побыту. Выяўленне поглядаў на свет, прыроду і чалавека, міфалагічныя матывы ў народных песнях. Непарыўнасць вымыслу і рэальнасці. Еднасць чалавека і прыроды. Глыбокі лірызм, напеўнасць народных песень.

«Каля месяца, каля яснага...», «А ў суботу проці нядзелі...», «Рэчанька». Сувязь сямейна-абрадавых песень з асноўнымі этапамі жыццёвага шляху чалавека: нараджэннем, шлюбам і смерцю. Мэта песень – абараніць чалавека ад злога і шкоднага, падтрымаць у цяжкіх сітуацыях, спрыяць шчасліваму жыццю. Ідэалізацыя – асноўны метад адлюстравання рэчаіснасці ў абрадавых песнях. Велічанне і заклінанне як неад’емныя кампаненты абрадавай паэзіі.

Алесь Ставер. «Жураўлі на Палессе ляцяць...» як адна з песенных візітак Беларусі. Патрыятычны пафас твора. Апяванне непаўторнай красы роднай зямлі. Радаснае адчуванне еднасці з радзімай, яе прыродай і дарагімі сэрцу краявідамі. Усхваляванасць і пранікнёнасць радкоў верша, іх мілагучнасць, узнёсласць пачуццяў. Выкананне песні ансамблем «Песняры» (музыка І.Лучанка).

Алесь Бачыла. «Радзіма мая дарагая...». Спавядальныя інтанацыі верша. Спалучэнне высокага патрыятычнага пафасу з гранічнай шчырасцю выказвання і эмацыянальнасцю самавыражэння. Паэтызацыя прыгажосці роднай зямлі, захапленне яе краявідамі, пажаданне шчаслівай будучыні. Адчуванне паэтам моцнай духоўнай повязі з Радзімай, яе народам. Напеўнасць радкоў верша, пакладзеных на музыку У. Алоўнікавым.

Тэорыя літаратуры. Міф (агульнае паняцце). Беларускія народныя песні. Мастацкія прыёмы і сродкі: звароты, паўторы, эпітэты, параўнанні, памяншальна-ласкальныя словы (пачатковыя паняцці). Літаратурная песня.

Мастацтва. Музыка: І.Лучанок. «Жураўлі на Палессе ляцяць...» (словы А.Ставера); У.Алоўнікаў. «Радзіма мая дарагая...» (словы А.Бачылы); творы І.Лучанка ў выкананні ансамбля «Песняры»: кампакт-дыск; «Лепшае»: кампакт-дыск (гурт «Палац»); «Ой, у лузе, лузе...»: кампакт-дыск (гурт «Ліцвіны»); «Троіца»: кампакт-дыск (этнагурт «Троіца»); тэлепраект «Сто песень для Беларусі» (Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія Рэспублікі Беларусь).

## МАСТАЦКАЕ СЛОВА: ВОБРАЗНАСЦЬ, ВЫРАЗНАСЦЬ, ХАРАСТВО (9 гадзін)

Змітрок Бядуля. «Зямля». Паэтызацыя роднай зямлі і крэўнай еднасці з

ёю. Вобразнасць пейзажнага малюнка, метафарычная яскравасць аўтарскай мовы. Мастацкая роля ў тэксце эпітэтаў, параўнанняў, метафар.

Паўлюк Трус. «Падаюць сняжынкі...» (урывак з паэмы «Дзясяты падмурак»). Хараство зімовага пейзажу. Выяўленне аўтарскіх пачуццяў у творы. Мілагучнасць мовы. Выразнасць выяўленчых сродкаў (метафар, эпітэтаў).

Рыгор Барадулін. «Уцякала зіма ад вясны». Казачна-адухоўлены свет верша. Насычанасць паэтычнай вобразнасці. Роля ўвасабленняў і метафар у стварэнні запамінальнай карціны вясновай прыроды.

Янка Брыль. «Над зямлёй – красавіцкае неба...». Маляўнічасць вясновага пейзажу. Багацце тропаў у тэксце, іх роля ў выяўленні хараства навакольнага свету.

Іван Мележ. «Першы іней» (урывак з рамана «Подых навальніцы»). Яркасць і карціннасць пейзажнага малюнка ранняй восені. Вастрыня ўражанняў і эмацыянальная вобразнасць мовы аўтара. Выяўленчая роля эпітэтаў, увасабленняў, метафар.

Максім Танк. «Восень». Адлюстраванне хараства і непаўторнасці восеньскай прыроды. Роля вобразна-выяўленчых сродкаў у творы.

Іван Грамовіч. «Воблакі». Захапленне незвычайнай прыгажосцю воблакаў, іх колерам, рухам па небе. Выяўленне багатай аўтарскай фантазіі. Эмацыянальная афарбаванасць аўтарскіх пачуццяў у апавяданні. Разнастайнасць выяўленчых сродкаў у творы.

Тэорыя літаратуры. Сродкі мастацкай выразнасці мовы: эпітэт, параўнанне (паглыбленне паняццяў), метафара, увасабленне (пачатковыя паняцці).

Мастацтва. Жывапіс: Ф.Рушчыц. «Вясна»; В.Бялыніцкі-Біруля. «Зімовы сон», «Веснавы дзень»; У.Кудрэвіч. «Раніца вясны»; П.Крахалёў. «Блакітная вясна»; П.Масленікаў. «Зацвіло жыта»; Ф.Дарашэвіч. «У пойме ракі Бярэзіны»; С.Каткоў. «Хутар Альбуць»; І.Карасёў. «Залатая восень»; В.Цвірка. «Верасень»; А.Бараноўскі. «Воблакі плывуць над зямлёй роднай». Музыка: І.Лучанок. «Падаюць сняжынкі...» (словы П.Труса). Фотамастацтва: В.Алешка. «Пакланіся прыродзе»: альбом; С.Плыткевіч. «Спатканне з лесам»: альбом; «Мая Беларусь»: альбом.

## ЛІТАРАТУРА ЯК ЧАЛАВЕКАЗНАЎСТВА (7 гадзін)

Алена Васілевіч. «Сябры». Маральна-этычная праблема твора. Узаемаадносіны Лёні і Грышы. Хвароба Лёні як вынік легкадумнага ўчынку сябра. Прыёмы псіхалагічнай абмалёўкі характараў. Сюжэт і кампазіцыя апавядання. Аўтар-апавядальнік у творы.

Кузьма Чорны. «Насцечка». Бацькі і дзеці: праблемы гуманнасці, высакароднасці, сумленнасці. Пісьменнік як знаўца чалавечай душы і тонкі

псіхолаг: пільная назіральнасць, увага да жыццёвых падрабязнасцей, унутранага стану герояў, раскрыццё матываў іх учынкаў і паводзін. Вобраз Насцечкі – галоўнай гераіні аповесці. Характарыстыка Сержа праз канкрэтныя ўчынкі. Тэма мінулага ў аповесці як сродак раскрыцця характараў герояў старэйшага пакалення. Адметнасць будовы твора.

Тэорыя літаратуры. Жанры апавядання і аповесці (пачатковае паняцце).

## ТЭМЫ І ВОБРАЗЫ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ (20 гадзін)

### Гістарычная тэма (4 гадзіны)

Пятрусь Броўка. «Яшчэ ў дні старыя, у век наш лучынны...». Асаблівасці выўлення гістарычнага шляху беларускага народа.

Іван Саверчанка. «Векавая мудрасць». Мастацкае ўвасабленне ў творы вобраза Рагвалода. Адлюстраванне кніжнай культуры.

Уладзімір Бутрамееў. «Славутая дачка Полацкай зямлі». Жыццё Рагнеды, яе прыгажосць і пачуццё годнасці. Сутыкненне яе свабодалюбівай натуры з эгаізмам і агрэсіяй Уладзіміра. Спалучанасць лёсу Рагнеды з гісторыяй роднай зямлі.

### Ваенная тэма (5 гадзін)

Аляксей Пысін. «Проня». Вобраз зняволенай беларускай ракі, якой чужынцы ўчыняюць допыт. Адухаўленне ракі, наданне ёй рыс характару гераічнага чалавека: вальналюбства, смеласці, мужнасці. Рака як алегарычнае (іншасказальнае) увасабленне народа і няскоранасці яго духу. Роля дыялогу ў стварэнні яе вобраза.

Анатоль Вярцінскі. «Два полі». Элегічнасць і чуйнасць у паэтычным выказванні, задушэўнасць і пранікнёнасць аўтарскага самавыяўлення. Кантраснасць вобразаў і лаканізм апісанняў, пачуццё светлага суму.

Вячаслаў Адамчык. «Салодкія яблыкі». Жыццёвая аснова твора. Успрыманне вайны праз дзіцячую свядомасць. Заўчаснае сталенне хлопчыкаў, іх беды і клопаты, дзіцячыя забавы. Сумленнасць і праўдзівасць Тоніка, абвостранае адчуванне ім уласнай віны ў гібелі Арсенікавага бацькі. Адносіны аўтара да герояў і адлюстраваных падзей. Кампазіцыя апавядання.

Аркадзь Куляшоў. «Над спаленай вёскай...». Матыў памяці аб мірных жыхарах, якія загінулі ў полымі. Роля сродкаў мастацкай выразнасці пры стварэнні вобразаў твора.

## Экалагічная тэма (8 гадзін)

Пімен Панчанка. «Сармацкае кадзіла». Паэтызацыя аўтарам багацця і разнастайнасці флоры. Трывожны роздум аб прыродзе, знявечанай чалавекам. Запозненае раскаянне чалавека за свае ўласныя ўчынкі, страту адказнасці за лёс усяго жывога на зямлі. Ідэя твора: занядбанне і спусташэнне прыроды – непазбежнае збядненне свету і чалавечай душы. Апавядальная інтанацыя.

Іван Пташнікаў. «Алені». Гуманістычны пафас твора. Майстэрства пісьменніка ў стварэнні яркіх, маляўнічых карцін прыроды. Вобраз аленя Рагатага. Вобраз дзяўчынкі Іркі. Драматычна-эмацыянальная напружанасць у развіцці сюжэта. Адлюстраванне праяў чалавечай хцівасці і жорсткасці. Лірызм твора.

Алесь Жук. «Стары бабёр» (урывак з аповесці «Паляванне на Апошняга Жураўля»). Непаўторны свет прыроды, якая жыве па сваіх законах. Эмацыянальная афарбаванасць сюжэтнага дзеяння, адухоўленасць аўтарскіх апісанняў прыроды. Вобраз старога бабра, яго трывога за лёс бабрынай сям’і. Тэма ўзаемаадносін чалавека і прыроды. Багацце сродкаў мастацкай выразнасці.

Янка Маўр. «Багіра». Жыццёвая аснова твора. Займальнасць і дынамізм сюжэта. Гісторыя Багіры і яе кацянят, адносіны да іх дарослых і дзяцей. Асоба аўтара-апавядальніка ў творы.

## Алегарычныя і сатырычныя вобразы (3 гадзіны)

Якуб Колас. «Конь і сабака». Сюжэт байкі, яе алегарычны змест. Вобразы пазбаўленага волі каня і нахабнага, агрэсіўнага сабакі Рудзькі. Выкрыццё ўяўнай смеласці і дужасці. Мараль байкі.

Алесь Звонак. «Гарбуз». Высмейванне зазнайства, самаўпэўненасці, ганарыстасці, хвалебнасці праз абмалёўку вобраза веліканa-гарбуза. Роля параўнанняў у адлюстраванні паводзін героя твора. Мараль байкі.

Уладзімір Корбан. «Малпін жарт». Арыгінальнасць сюжэта байкі. Асуджэнне ў творы людзей, якія распальваюць звадкі ды сваркі і адчуваюць пры гэтым радасць.

Тэорыя літаратуры. Тэма мастацкага твора (паглыбленне паняцця), ідэя мастацкага твора, мастацкі вобраз (пачатковае паняцце). Кампазіцыя твора (пачатковае паняцце). Аўтар-апавядальнік у творы. Літаратурны герой (паглыбленне паняцця). Жанр байкі (азнаямленне з паняццем).

Мастацтва. Жывапіс: А.Сцяпанаў. «Цугам»; М.Савіцкі. «Поле»; В.Бялыніцкі-Біруля. «Зноў зацвіла вясна»; В.Юркоў. «Апошнія яблыкі»; Ф.Янушкевіч. «Рагнедзін лёс. Сцяна памяці». Музыка: Э.Ханок. «Два полі» (словы А.Вярцінскага).

## ФАНТАСТЫКА (3 гадзіны)

Раіса Баравікова. «Гальштучнік» (урывак з «Аповесці чатырох падарожжаў»). Фантастычныя падзеі ў аснове сюжэта твора, яго займальнасць. Наведванне астранаўтамі невядомай Зялёнай планеты, сустрэча з яе жыхарамі. Незвычайны падарунак, які атрымаў доктар Савіч ад гуманоідаў, рэзкія перамены ў яго паводзінах. Жыццё Савіча пасля міжпланетнай вандроўкі. Неверагоднае, чароўнае пераўвасабленне на Зямлі загадкавай істоты ў птушку з чорнай палосачкай-гальштукам. Новая экспедыцыя да сузор’я Дзевы. Мастацкая ідэя і праблемы твора.

Мастацтва. Жывапіс: Я.Драздовіч. «Космас», «Фантастычны замак»; цыклы «Жыццё на Марсе», «Жыццё на Месяцы», «Жыццё на Сатурне»; Г.Вашчанка. «Подых стагоддзя».

Паўтарэнне і падагульненне вывучанага за год (1 гадзіна).

### Спіс твораў для завучвання на памяць і мастацкага расказвання

Алесь Пісьмянкоў. «Продкі».

Алесь Ставер. «Жураўлі на Палессе ляцяць...».

Паўлюк Трус. «Падаюць сняжынкі...» (урывак з паэмы «Дзясяты падмурак»).

Анатоль Вярцінскі. «Два полі».

Якуб Колас. «Конь і сабака».

### Спіс твораў для дадатковага чытання

Генадзь Аўласенка. «Чаму Дукоры такую назву маюць».

Янка Брыль. «Маці».

Анатоль Бутэвіч. «У гасцях у вечнасці».

Святлана Быкава. «Легенда Заслаўя».

Васіль Вітка. «Трывога ў Ельнічах».

Якуб Колас. «Купальскія светлякі».

Янка Маўр. «У краіне райскай птушкі».

Іван Навуменка. «Дзяцінства».

Алесь Пальчэўскі. «Рэкс і Казбек».

Іван Пташнікаў. «Арчыбал».

Генрык Сянкевіч. «Незабыўная старонка славянскай мінуўшчыны».

Кацярына Хадасевіч-Лісавая. «Ключ ад Вялікай Каштоўнасці».

Дзінтра Шулцэ. «Роберцік».

Аляксей Якімовіч. «Эльдарада просіць дапамогі».

### Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў VI класа

Ведаць:

аўтараў, назвы і змест вывучаных твораў;

адметныя ўласцівасці народных і літаратурных песень;

выяўленчыя сродкі мастацкай выразнасці мовы;

звесткі па тэорыі літаратуры, неабходныя для аналізу мастацкага твора;

творы для завучвання на памяць;

умець:

выразна, у патрэбным тэмпе чытаць уголас літаратурныя творы, выяўляючы аўтарскую пазіцыю і свае адносіны да зместу твора;

узнаўляць мастацкія карціны, створаныя пісьменнікам;

самастойна дзяліць твор на часткі;

складаць план невялікага апавядальнага твора ці ўрыўка з яго;

сцісла, выбарачна або падрабязна вусна пераказваць невялікі апавядальны твор ці ўрывак з яго;

вылучаць эпізоды ці дэталі, важныя для характарыстыкі дзейных асоб;

знаходзіць сувязь паміж падзеямі ў вывучаным творы;

знаходзіць выяўленчыя сродкі мовы і з дапамогай педагагічнага работніка вызначаць іх ролю ў стварэнні вобраза, раскрыцці тэмы твора;

характарызаваць героя мастацкага твора па яго ўчынках, паводзінах, перажываннях;

рыхтаваць сачыненні з элементамі апісання і разважання (разгорнуты адказ, адказ на пытанне і паведамленне пра героя), апісваць свае назіранні і ўражанні ад падзей і з’яў жыцця;

даваць водгук на самастойна прачытаны літаратурны твор і на творы іншых відаў мастацтва, выказваючы свае адносіны да герояў і падзей;

карыстацца даведачным апаратам вучэбнага дапаможніка;

валодаць:

навыкамі выяўлення адметных рыс характару герояў, тыповага ў іх паводзінах, стаўленні да жыцця;

уменнямі і навыкамі вуснага і пісьмовага маўлення, лагічнага выказвання думак, дастатковым запасам маўленчых сродкаў;

навыкамі параўнання літаратурных твораў з творамі жывапісу, музыкі і іншых відаў мастацтва;

рознымі відамі літаратурна-творчай дзейнасці (напісанне сачынення, складанне паведамлення);

навыкамі работы з даведачнай літаратурай па пэўнай тэме (слоўнікі, даведнікі, энцыклапедыі, інтэрнэт-рэсурсы).

## VII клас

Усяго 53 гадзіны:

на вывучэнне твораў – 46 гадзін;
на навучальныя сачыненні – 2 гадзіны;
на ўрокі па творах для дадатковага чытання – 4 гадзіны;
рэзерв вучэбнага часу – 1 гадзіна.

## УВОДЗІНЫ (1 гадзіна)

Мастацтва ў жыцці народа. Літаратура сярод іншых відаў мастацтва. Талент у мастацтве. Вобраз мастака (музы́кі) у беларускіх літаратурных творах.

## ЛІТАРАТУРА – МАСТАЦТВА СЛОВА (4 гадзіны)

Якуб Колас. «У яго быў свет цікавы...» (урывак з паэмы «Сымон-музыка»). Незвычайна адораная натура хлопчыка. Сымонка – прыроджаны паэт. Выключная ўражлівасць, тонкае адчуванне хараства навакольнага свету, яго гукаў і фарбаў, паэтычнае адухаўленне прыроды.

Янка Купала. «Курган». Тэма мастацтва і мастака. Вобраз гусляра як выразніка народнага светапогляду, неадольнага імкнення народа да справядлівасці, свабоднага жыцця. Князь як увасабленне зла. Сутыкненне духоўнасці, маральнасці, гуманізму з бездухоўнасцю, эгаізмам і бесчалавечнасцю – галоўны канфлікт твора. Маральная перамога гусляра над князем. Рамантычны характар сюжэта, вобразаў паэмы, асаблівасці кампазіцыі. Сувязь твора з фальклорам.

Тэорыя літаратуры. Паэма як жанр (пачатковае паняцце).

Мастацтва. Музыка: Якуб Колас. Сымон-музыка [Электронны рэсурс]: мультымедыйнае выданне / Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Я. Коласа. – Мінск: Ковчег, 2010. – 1 электронны аптычны дыск (CD-ROM); Творы па беларускай літаратуры для завучвання на памяць [Гуказапіс]: паэмы, вершы, проза, песні: для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту: беларуская літаратура (базавы, паглыблены і павышаны ўзроўні) / па заказу Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2006 – 2007. – (Бібліятэка школьніка). Жывапіс: А.Цыркуноў. «Гусляр»; Х.Ліўшыц. «Музыка»; М.Басалыга. «Курган»; В.Шаранговіч. «Курган». Тэатральнае мастацтва: спектакль «Сымон-музыка» (Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы, рэжысёр М.Пінігін).

## ВЕРШАВАНЫЯ І ПРАЗАІЧНЫЯ МАСТАЦКІЯ ТВОРЫ (5 гадзін)

Якуб Колас. «Ручэй». Вобраз ручая ў вершы. Эмацыянальная выразнасць твора, паэтычная адухоўленасць вобраза ручая і карцін наваколля. Замілаванне прыгажосцю роднай прыроды, перададзенае праз

шматлікія яркія эпітэты, метафары. Рытмічнасць мовы верша.

Тарас Хадкевіч. «Крынічка». Мастацкая замалёўка крынічкі ў празаічным творы. Разгорнутасць, канкрэтнасць апісання, уласцівая прозе, увага да жыццёвых падрабязнасцей, нетаропкасць, разважлівасць аповеда, роўнасць інтанацыі. Празаічная, свабодна арганізаваная мова твора.

Васіль Быкаў. «Незагойная рана». Драматычны змест твора. Нясцерпная туга старой Тэклі па сыне, які не прыйшоў з вайны. Шматбаковае падрабязнае апісанне жыцця і побыту жанчыны-маці, яе знешняга аблічча (партрэт), паводзін, цяжкіх перажыванняў. Роля ўспамінаў, сну аб вяртанні Васілька з вайны, эпізадычных персанажаў (калгаснага пісьманосца, суседкі Ульянкі, хлопца на малатарні), пейзажных замалёвак у раскрыцці драматызму становішча старой жанчыны, якая страціла сына. Псіхалагічнае майстэрства Васіля Быкава ў паказе абставін і характараў.

Васіль Зуёнак. «З вайны сустрэлі мацяркі сыноў...». Абагульнена-эмацыянальнае раскрыццё тэмы ў вершы. Паэтычнае выяўленне бясконцага гора маці, якія страцілі сваіх дзяцей на вайне. Адрозненні ў празаічным і паэтычным адлюстраванні тэмы чалавечага гора ў апавяданні Васіля Быкава і ў вершы Васіля Зуёнка.

Тэорыя літаратуры. Пейзаж (пачатковае паняцце). Адметнасць паэтычных і празаічных твораў. Рытм і рыфма (пачатковыя паняцці).

Мастацтва. Музыка: М.Чуркін. «Ручэй» (словы Я.Коласа); Ю.Семяняка. «Нашы маці» (словы А.Бачылы); Я.Глебаў. «За бацькамі – сыны» (словы П.Макаля). Жывапіс: М.Залозны. «Салдаткі».

## ПАЭЗІЯ. РАЗНАСТАЙНАСЦЬ ІДЭЙНА-ЭСТЭТЫЧНАГА ПАФАСУ ПАЭТЫЧНЫХ ТВОРАЎ (9 гадзін)

Максім Танк. «Паэзія». Мастацкае асэнсаванне сутнасці і прызначэння паэзіі. Абагульненне ў вершы розных бакоў жыцця: светлых мар і гераічных здзяйсненняў, вялікіх надзей і горкіх расчараванняў. Параўнанні-азначэнні як сродак раскрыцця зместу і ідэйнага сэнсу верша.

Максім Багдановіч. «Маёвая песня» («Па-над белым пухам вішняў...»). Майстэрства Максіма Багдановіча ў перадачы шматколернасці навакольнага свету, тонкіх адценняў яго гукавой гамы. Зрокавыя і слыхавыя асацыяцыі ў вершы. Роля эпітэтаў, метафар, гукапісу. Вершаваны памер і рытмічныя асаблівасці твора.

Данута Бічэль. «Роднае слова». Прызнанне ў любові да роднага краю, роднай мовы праз паэтычныя звароты, метафарычныя тропы, эпітэты. Роля адухаўленняў і ўвасабленняў у стварэнні вобраза Радзімы.

Мікола Шабовіч. «Хоць не бачыў чужых я краін...». Асаблівасці адлюстравання малой радзімы ў вершы. Роля мастацкіх сродкаў пры

стварэнні вобразнага багацця твора.

Еўдакія Лось. «Дзяўчаты мінулай вайны». Спалучэнне лірычнага, грамадзянскага і трагічнага ў вершы. Вайна як час «будзённага гераізму»: апісанне рэалій ваеннага жыцця ў творы. Роля сродкаў мастацкай выразнасці ў раскрыцці збіральнага вобраза «дзяўчына на вайне»: тропы, асаблівасці паэтычнага сінтаксісу, рытміка-інтанацыйнага малюнка. Гуманістычны пафас верша.

Ніл Гілевіч. «Маці». Разгорнутае паэтычнае прызнанне ў любові да маці. Форма ўспамінаў, задушэўнасць размовы, звернутай да маці. Роля тропаў і паэтычнага сінтаксісу ў раскрыцці мастацкай ідэі верша.

Якуб Колас. «Дзядзька-кухар» (урывак з паэмы «Новая зямля»). Майстэрства паэта ў абмалёўцы характару дзядзькі Антося, выяўленне яго душэўнай дабрыні, чуласці, вынаходлівасці, педагагічнага таленту. Камічнасць сітуацый як аснова гумару. Народнасць мовы.

Тэорыя літаратуры. Паэзія як тып мастацтва слова (паглыбленне паняцця). Роля рытму ў паэтычных творах. Гукапіс. Вершаскладанне. Віды стоп і памераў у вершах. Двухскладовыя і трохскладовыя стопы (пачатковыя паняцці). Метафара і ўвасабленне (паглыбленне паняцця).

Мастацтва. Музыка: І. Палівода. «Па-над белым пухам вішняў» (словы М.Багдановіча). Жывапіс: І.Рэй. «З вогненнай вёскі»; М.Савіцкі. «Лічбы на сэрцы»: альбом; Г.Бржазоўскі. «Лён»; Ф.Жураўкоў. «Лён»; І.Давідовіч. «Вершы»; Л.Ран. «Дзядзька Антось».

## АДЛЮСТРАВАННЕ ЖЫЦЦЯ Ў ПРАЗАІЧНЫХ ТВОРАХ (14 гадзін)

Змітрок Бядуля. «На Каляды к сыну». Бацькі і дзеці: праблемы маральнасці, гуманнасці, вернасці свайму народу. Сацыяльны змест калізіі. Псіхалагізм апавядання, майстэрства пісьменніка ў раскрыцці думак і перажыванняў старой Тэклі. Характарыстыка сына Тэклі Лаўрука праз канкрэтныя выразныя дэталі. Роля пейзажу ў творы.

Іван Навуменка. «Настаўнік чарчэння». Роля асобы настаўніка ў фарміраванні жыццёвых перакананняў вучняў. Нетрадыцыйны падыход аўтара да раскрыцця псіхалогіі Апалінарыя Феакціставіча. Адлюстраванне ў вобразе Косці Кветкі ідэі настаўніка – любіць сваю Радзіму і быць гатовым аддаць за яе жыццё. Роля мастацкай дэталі ў раскрыцці вобразаў галоўных герояў. Абвостранасць гуманістычнай думкі апавядання.

Янка Брыль. «Урокі пані Мар’і» (урывак з аповесці «Сірочы хлеб»). Пані Мар’я як школьны настаўнік і настаўнік у жыцці: яе ўплыў на духоўнае сталенне асобы Даніка Мальца. Майстэрства пісьменніка ў раскрыцці вобразаў-персанажаў. Выразнасць апісанняў, дыялогі, характэрныя дэталі ў творы.

Уладзімір Шыцік. «Лісцік серабрыстай таполі». Займальнасць сюжэта

апавядання. Дапытлівасць і няўрымслівасць падлеткаў у пазнанні таямніц наваколля і свету. Роля аповеда і дыялогу ў творы.

Мікола Лупсякоў. «Мэры Кэт». Асаблівасці адлюстравання жыцця ў творы: характарыстыка герояў, паказ іх узаемаадносін, нараджэння першага кахання, якое адкрывае «радасную прыгажосць жыцця». Мяккі гумар, лірызм, адзнакі лёгкай іроніі ў апавяданні. Паэтычная выразнасць мовы.

Тэорыя літаратуры. Проза як тып мастацтва слова (паглыбленне паняцця). Мастацкая дэталь (пачатковае паняцце). Аповед, апісанне, дыялог як спосабы раскрыцця зместу ў апавядальных творах. Віды апісанняў: пейзаж, партрэт (паглыбленне паняцця).

Мастацтва. Жывапіс: М.Казакевіч. «Юнацтва»; С.Гарачаў. «Дзяцінства»; Б.Кузняцоў. «Дзеці».

## ПАЭЗІЯ Ў ПРОЗЕ І ПРОЗА Ў ПАЭЗІІ (3 гадзіны)

Змітрок Бядуля. «Шчасце не ў золаце». Выяўленне ўласнага гонару простага чалавека перад спакусай багатага жыцця. Лаканізм формы, ужыванне сродкаў, якія ўзмацняюць эмацыянальную выразнасць мовы (эпітэты, інверсія), як адзнакі паэтычнасці твора.

Віктар Шніп. «Сям'я». Паэзія ў форме свабодна арганізаванай мовы. Элементы рытмічнасці ў свабодным вершы. Скіраванасць свабоднага верша да філасофскага зместу, нечаканых асацыяцый, паэтызацыя пачуццяў і перажыванняў. Лаканічнасць.

Тэорыя літаратуры. Паэтычная (лірычная) проза (пачатковае паняцце). Свабодны верш (пачатковае паняцце).

Мастацтва. Жывапіс: М.Басалыга. Ілюстрацыі да зборнікаў Максіма Танка; Б.Звінагродскі. «Сож. Вялікая вада», «Пойма ракі Бярэзіны».

## ПАКАЗ ЖЫЦЦЯ Ў МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ, ПУБЛІЦЫСТЫЦЫ І НАВУЦЫ (9 гадзін)

Цётка. «Шануйце роднае слова». Патрыятычны пафас артыкула, заклапочанасць лёсам роднай культуры. Прыёмы і сродкі ўздзеяння на пачуцці і думкі чытача ў публіцыстычным творы: лагічныя довады і эмацыянальныя звароты, заклікі да актыўнай дзейнасці ў падтрымку роднай культуры.

Уладзімір Караткевіч. «Зямля пад белымі крыламі» (скарочана). Цыкл мастацкіх нарысаў пра Беларусь, яе гісторыю, прыроду, культурныя традыцыі народа. Патрыятычная ідэя ў нарысах. Роля гумарыстычных, іранічных элементаў у выяўленні аўтарскіх адносін да асобных жыццёвых з'яў. Назіральнасць пісьменніка. Дакументальнасць жыццёвага матэрыялу.

Сувязь твора з этнаграфічнай навукай. Сродкі мастацкага паказу жыцця ў нарысах. Публіцыстыка як разнавіднасць прозы.

Леанід Дайнека. «Меч князя Вячкі» (пяты раздзел – скарочана). Вобразы князя Вячкі і яго дружыннікаў. Іх ворагі – крыжакí. Прыгодніцкія элементы ў сюжэце. Роля фантазіі пісьменніка ў стварэнні карцін мінулага. Асаблівасці адлюстравання гістарычных падзей у мастацкім творы і навуковай літаратуры (урывак з раздзела «Супрацьстаянне крыжака́м» вучэбнага дапаможніка па гісторыі).

Уладзімір Караткевіч. «Балада пра Вячку, князя людзей простых». Паэтычнае ўвасабленне вобраза Вячкі як героя-патрыёта, змагара супраць ворагаў Радзімы – крыжако́ў. Мужнасць, адвага героя, яго непрымірымасць да захопнікаў, рашучасць змагацца нават у безвыходнай сітуацыі. Эмацыянальная напружанасць аповеда, багацце гіпербалічных тропаў. Гераічны пафас твора.

Тэорыя літаратуры. Літаратурная публіцыстыка (пачатковае паняцце). Адрозненне мастацкага адлюстравання жыцця ад навуковага. Нарыс як жанр. Балада як жанр (пачатковае паняцце).

Мастацтва. Жывапіс: Г.Вашчанка. «Мацярынскія крылы»; У.Старчакоў. «Зноў на радзіму»; Н.Шчасная. «У гэта веру». Гравюры: Ф.Бразоўскі. «Гара Міндоўга ў Навагрудку» (гравюра XIX ст.).

Паўтарэнне і падагульненне вывучанага за год (1 гадзіна).

Спіс твораў для завучвання на памяць і мастацкага расказвання

Янка Купала. «Курган» (любы раздзел на выбар вучняў).

Якуб Колас. «Ручэй».

Максім Багдановіч. «Маёвая песня» («Па-над белым пухам вішняў...»).

Мікола Лупсякоў. Урывак з апавядання «Мэры Кэт» (пачынаючы са слоў «Я чую... Я чую, як шуміць вецер...» і да канца твора).

Змітрок Бядуля. «Шчасце не ў золаце».

Спіс твораў для дадатковага чытання

Вячаслаў Адамчык. «Урок арыфметыкі».

Уладзімір Аляхновіч. «Першае каханне».

Янка Брыль. «Сірочы хлеб».

Васіль Быкаў. «Круты бераг ракі».

Алена Васілевіч. «Горкі ліпавы мёд».

Жуль Верн. «Таямнічы востраў».

Анатоль Вярцінскі. «Рэквіем па кожным чацвёртым».

Уладзімір Караткевіч. «Кніганошы».

Джэк Лондан. «Белы клык».

Уладзімір Мазго. «Адвечныя скарбы Радзімы».
Павел Міська. «Эрпіды на планеце Зямля».
Іван Навуменка. «Жуль Верн».
Яраслаў Пархута. «Апошні гусляр».
Іван Саверчанка. «Ваярскі чын князя Вячкі».
Янка Сіпакоў. «Зялёны лісток на планеце Зямля».
Андрэй Федарэнка. «Афганская шкатулка».
Міхась Чарняўскі. «Страла расамахі».
Уладзімір Шыцік. «Зорны камень».

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў VII класа

Ведаць:
аўтараў, назвы і змест праграмных твораў;
выяўленчыя сродкі мастацкай выразнасці мовы;
звесткі па тэорыі літаратуры, неабходныя для аналізу мастацкага твора;
творы для завучвання на памяць;
умець:
выразна і правільна, у дастаткова хуткім тэмпе чытаць уголас мастацкія, навукова-папулярныя і публіцыстычныя тэксты, выяўляючы аўтарскую пазіцыю і свае адносіны да адлюстраванага;
супастаўляць блізкія па тэме творы розных родаў і жанраў і вызначаць іх асаблівасці ў паказе жыцця;
сцісла, выбарачна або падрабязна пераказваць невялікі апавядальны твор ці ўрывак з яго;
выдзяляць эпізоды або дэталі, важныя для характарыстыкі дзейных асоб, устанаўліваць прычынна-выніковую сувязь паміж падзеямі і паводзінамі герояў;
характарызаваць героя літаратурнага твора па яго ўчынках, паводзінах, перажываннях;
знаходзіць у тэксце выяўленчыя сродкі мовы і такія спосабы раскрыцця зместу, як аповед, апісанне, партрэт, пейзаж, дыялог, вызначаць іх ролю ў стварэнні вобраза, раскрыцці ідэі твора;
складаць план празаічнага твора або асобных яго раздзелаў;
рыхтаваць сачыненне-разважанне (разгорнуты адказ на пытанне і паведамленне пра героя); апісанне сваіх жыццёвых уражанняў, роздумаў аб розных з’явах жыцця;
даваць водгук на самастойна прачытаны літаратурны твор (выказванне сваіх адносін да герояў, падзей) і творы іншых відаў мастацтва;
карыстацца даведачным апаратам вучэбных дапаможнікаў;
узнаўляць мастацкія карціны, створаныя пісьменнікам;
даваць разгорнуты адказ на пытанне, ставіць пытанні да літаратурнага

тэксту;

валодаць:

навыкамі абагульнення і супастаўлення вывучанага, выяўлення адметных рыс характару герояў, тыповага ў іх паводзінах, стаўленні да жыцця;

уменнямі і навыкамі вуснага і пісьмовага маўлення, лагічнага выказвання думак, дастатковым запасам маўленчых сродкаў;

навыкамі параўнання літаратурных твораў з творамі жывапісу, музыкі і іншых відаў мастацтва;

рознымі відамі літаратурна-творчай дзейнасці (напісанне сачынення, рэферата, даклада);

навыкамі работы з даведачнай літаратурай па пэўнай тэме (слоўнікі, даведнікі, энцыклапедыі, інтэрнэт-рэсурсы).

## VIII клас

Усяго 53 гадзіны:

на вывучэнне твораў – 46 гадзін;

на навучальныя сачыненні – 2 гадзіны;

на ўрокі па творах для дадатковага чытання – 4 гадзіны;

рэзерв вучэбнага часу – 1 гадзіна.

### УВОДЗІНЫ (1 гадзіна)

Чалавек як галоўны аб’ект увагі мастацкай літаратуры, спосабы яго паказу ў творах.

### РОДЫ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ (7 гадзін)

Рыгор Барадулін. «Трэба дома бываць часцей». Адносіны чалавека да роднага дому, мясцін, дзе праходзіла дзяцінства і юнацтва. Пачуцці і перажыванні, звязаныя з успамінамі пра родных і блізкіх, як выяўленне духоўнасці асобы. Выкарыстанне вобразных магчымасцей мовы (эпітэты, метафары), рытмічных сродкаў. Адметнасць аўтарскай інтанацыі.

Віктар Карамазаў. «Дзяльба кабанчыка». Асуджэнне духоўнага адчужэння дарослых дзяцей ад бацькоўскага дому. Клопат маці пра дзяцей і душэўная чэрствасць, няўвага да яе з боку дачок і зяця. Усведамленне сынам Сцяпанам віны перад бацькамі, шчымлівае пачуццё жалю да хворай маці. Майстэрства пісьменніка ў абмалёўцы вясковага побыту, характарыстыка герояў праз іх паводзіны і ўчынкі, мастацкія дэталі. Характэрныя прыметы эпічнага твора.

Аляксей Дудараў. «Вечар». Лёсы састарэлых адзінокіх жыхароў

сучаснай вёскі. Вобразы Ганны, Мульціка, Гастрыта, іх чалавечыя драмы, жыццёвыя праблемы і клопаты. Вобразы-сімвалы сонца, калодзежа, вады, вечара. Сутыкненне розных жыццёвых філасофій Мульціка і Гастрыта: Мульцік – добразычлівы да людзей, сумленны, жартаўлівы, працавіты; Гастрыт – нікчэмны,ануры, азлоблены на ўсіх чалавек. Майстэрства Аляксея Дударава. Асаблівасці сюжэтнай, кампазіцыйнай пабудовы п’есы. Сімвалічнасць фіналу драмы.

Тэорыя літаратуры. Роды мастацкай літаратуры (пачатковае паняцце). Тэма, ідэя, праблема мастацкага твора (паглыбленне паняццяў).

Мастацтва. Музыка: І.Лучанок. «Трэба дома бываць часцей» (словы Р.Барадуліна). Тэатральнае мастацтва: «Вечар» – тэле-, радыё-, тэатральныя спектаклі (у пастаноўцы Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы і іншых тэатраў краіны).

## ЛІРЫЧНЫЯ ЖАНРЫ (14 гадзін)

Народныя песні «Бяроза з лістом...», «Зелянеюць, зелянеюць лугі, сенажаці...» (1 гадзіна). Народная вусна-паэтычная творчасць – крыніца лірычнай паэзіі. Віды народных песень. Паэтыка народнай песні: глыбокі лірызм, яркая вобразнасць, сімволіка, гіпербалізацыя, інверсія і іншыя характэрныя сродкі.

### Грамадзянская лірыка (3 гадзіны)

Янка Купала. «Спадчына». Лірычная споведзь паэта. Абвостранае пачуццё любові да Бацькаўшчыны, сцвярджэнне гістарычнага права беларусаў на нацыянальную і сацыяльную незалежнасць. Спалучэнне высокага грамадзянскага пафасу з гранічнай шчырасцю лірычнага выказвання.

Максім Багдановіч. «Слуцкія ткачыхі». Тэма гістарычнага мінулага. Выяўленне любові да радзімы і волі праз вобраз васілька – сімвал Бацькаўшчыны. Спалучэнне высокага патрыятычнага пафасу з задушэўнасцю выказвання. Кампазіцыя верша, яго мілагучнасць.

Уладзімір Караткевіч. «Беларуская песня». Гонар паэта за сваю радзіму, яе гісторыю, родную мову, за духоўна багатых і шчырых людзей. Высокі патрыятычны пафас. Урачыстасць інтанацыі, эмацыянальнасць выказвання, своеасаблівасць рытму, метафарычнасць мовы.

### Філасофская лірыка (3 гадзіны)

Максім Танк. «Шчасце». Роздум паэта пра сэнс жыцця чалавека, яго прызначэнне на зямлі. Радзіма, мова, сяброўства – аснова чалавечага

шчасця. Апавядальнасць інтанацыі, рытмічны малюнак верша.

Генадзь Пашкоў. «Пазвоніць аднойчы вясна...». Паэтызацыя разнастайнасці жыцця і неспакойнага духу чалавека, яго апантанасці ў пазнанні таямніц свету. Унутраны свет лірычнага героя. Роля вобразна-выяўленчых і рытміка-інтанацыйных сродкаў у выяўленні мастацкай ідэі твора.

Тэорыя літаратуры. Паэтычныя тропы (агульнае паняцце).

Анатоль Вярцінскі. «Жыццё даецца, каб жыццё тварыць...». Філасофскае асэнсаванне глыбінных асноў чалавечага быцця, сучаснага і вечнага. Злітнасць лёсу чалавека з лёсам радзімы і свету, усведамленне адказнасці за жыццё на зямлі. Сцвярджэнне актыўнай жыццёвай пазіцыі чалавека-грамадзяніна, чалавека-творцы. Форма маналогу ў раскрыцці ідэі твора. Інтанацыйна-сінтаксічны малюнак верша.

Інтымная лірыка (3 гадзіны)

Максім Багдановіч. «Раманс» («Зорка Венера»). Паэтызацыя ўзвышанага і прыгожага пачуцця – кахання. Душэўны стан лірычнага героя: светлы сум, лёгкі дакор лёсу за немінучае расстанне з каханай. Мастацкая выразнасць і пластычнасць вобразаў, цеплыня, даверлівасць інтанацыі, вытанчанасць, дасканаласць паэтычнай формы.

Аркадзь Куляшоў. «Бывай...». Пяшчотнае і шчымлівае развітанне з юнацкім каханнем. Глыбокі лірызм у выяўленні пачуццяў і перажыванняў – болю, горычы, смутку ад вымушанага расстання з каханай – як адметнасць жанру элегіі. Багацце асацыяцый, цеплыня і задушэўнасць выказвання, песеннасць і меладычнасць верша.

Пятрусь Броўка. «Пахне чабор». Паэтычная споведзь пра першае каханне. Разнастайная гама перажыванняў лірычнага героя. Паэтызацыя чысціні і прыгажосці трапяткога пачуцця. Адметнасць паэтычнага сінтаксісу і яго роля ў выяўленні мастацкай ідэі верша.

Тэорыя літаратуры. Паэтычны сінтаксіс: рытарычнае пытанне, інверсія, паўтор (рэфрэн) (азнаямленне з паняццем).

Пейзажная лірыка (2 гадзіны)

Якуб Колас. «О, край родны, край прыгожы!..» (урывак з паэмы «Сымон-музыка»). Паэтызацыя прыгажосці роднай старонкі, захапленне непаўторнасцю беларускіх пейзажаў. Адчуванне лірычным героем сваёй духоўнай сувязі з зямлёй продкаў. Майстэрства паэта ў перадачы шматколернасці навакольнага свету. Выяўленне паўнаты і радасці жыцця праз вобразны і інтанацыйны лад верша.

Уладзімір Мазго. «Я слухаю...». Паэтычнае адлюстраванне з’явы

прыроды і выражэнне аўтарскіх адносін да яе. Праблема гармоніі прыроды і чалавека. Асаблівасці мовы верша.

Міхась Башлакоў. «Верасень». Паэтычны вобраз ранняй восені, верасня. Захапленне лірычнага героя гэтай парой года. Асэнсаванне еднасці чалавека і прыроды. Метафарычнасць мовы верша.

Жанры лірыкі. Класічныя формы верша (2 гадзіны)

Максім Багдановіч. «Трыялет» («Калісь глядзеў на сонца я...»). Філасофскі роздум паэта пра сэнс чалавечага існавання, бясконцасць сусвету і шчасце пазнання яго чалавекам. Абвостраная ўспрымальнасць лірычнага героя, яго выключнасць у параўнанні з іншымі людзьмі, не здольнымі зразумець і прыняць яго перакананні. Вытанчанасць формы трыялета, рытміка-інтанацыйны лад твора.

Міхась Пазнякоў. «Ты ўжо на роднай Беларусі...» (з цыкла «Трыялеты (Максіму Багдановічу)». Філасофскае асэнсаванне ролі Радзімы ў жыцці чалавека. Вытанчанасць формы трыялета, рытміка-інтанацыйны лад твора. Пераемнасць традыцый.

Змітрок Марозаў. «Жаўрук». Выяўленне тэмы паэта і паэзіі праз разгорнутае параўнанне. Вобразная сістэма верша. Выяўленне ідэйнай скіраванасці ў санеце.

Анатоль Грачанікаў. «Свяці, кахання чыстая зара...». Раскрыццё пачуццяў і перажыванняў лірычнага героя. Актава – класічная форма паэзіі; яе дасканаласць і ўплыў на выяўленчыя асаблівасці верша. Афарыстычнасць мовы, выразнасць рытму і інтанацыі. Асаблівасці рыфмоўкі радкоў.

Тэорыя літаратуры. Паняцце пра лірыку. Віды, жанры лірыкі. Класічныя формы верша: элегія, раманс, трыялет, санет, актава. Лірычны герой (паглыбленне паняцця). Вершаскладанне: рытм, рыфма (паглыбленне паняццяў).

Мастацтва. Музыка: І.Лучанок. «Спадчына» (словы Я.Купалы); У.Мулявін. «Слуцкія ткачыхі» (словы М.Багдановіча); С.Рак-Міхайлоўскі. «Зорка Венера» (словы М.Багдановіча); І.Лучанок. «Алеся» (словы А.Куляшова); Л.Вольскі. «Пахне чабор» (словы П.Броўкі); «Песняры. Залаты дыск»: кампакт-дыск; «Песняры. Лепшыя песні» (ч. 1): кампакт-дыск; «Троіца»: кампакт-дыск (гурт «Троіца») і іншыя творы. Жывапіс: «Мая зямля»: альбом (укладальнік В.Трыгубовіч); «Беларускі савецкі жывапіс»: альбом (укладальнік А.Аладава) і іншыя творы. Фотамастацтва: «Пакланіся прыродзе»: альбом; В.Алешка. «Спатканне з лесам»: альбом; С.Плыткевіч. «Мая Беларусь»: альбом; Г.Ліхтаровіч. «Добры дзень, Беларусь»: альбом.

## ЭПІЧНЫЯ ЖАНРЫ (13 гадзін)

Якуб Колас. «Хмарка». Сувязь паэтыкі апавядання з вуснай народнай творчасцю, формай казкі. Алегарычна-філасофскі змест твора, яго патрыятычны пафас. Адказнасць кожнага чалавека перад сваёй Бацькаўшчынай за яе дабрабыт і росквіт як галоўная ўмова асабістага шчасця. Роля пейзажу ў раскрыцці ідэі твора.

Уладзімір Караткевіч. «Паром на бурнай рацэ». Гістарычная аснова апавядання. Характарыстыка галоўных герояў твора Горава і Пора-Леановіча. Элементы рамантычнай паэтыкі ў творы: зварот да гістарычнай тэмы, павышаная эмацыянальнасць аповеда, кантраснасць вобразаў і характараў, драматызацыя дзеяння і карцін прыроды. Роля канкрэтных апісанняў, мастацкіх дэталей у раскрыцці характараў. Тэма і ідэя апавядання.

Генрых Далідовіч. «Губаты». Ідэя дабрыні і міласэрнасці да прыроды. Майстэрства пісьменніка ў перадачы шматфарбнасці навакольнага свету праз апісанне пушчы і яе жыхароў, псіхалагізацыя вобраза ласяняці Губатага. Трагічны фінал – праява хцівасці і жорсткасці людзей. Лірычнасць апавядання. Развіццё сюжэта, кампазіцыя твора.

Васіль Быкаў. «Жураўліны крык». Мастацкая праўда ў паказе вайны. Паводзіны чалавека ў экстрэмальнай сітуацыі. Раскрыццё ў трагічных абставінах характараў герояў. Вытокі подзвігу старшыны Карпенкі, байцоў Глечыка, Фішара, Свіста. Праблема маральнага выбару. Глыбіня псіхалагічнага аналізу ў раскрыцці вобразаў Аўсеева і Пшанічнага. Арыгінальнасць кампазіцыі. Лірычны элемент у аповесці, яго роля.

Тэорыя літаратуры. Эпас як літаратурны род. Эпічныя жанры: апавяданне (паглыбленне паняцця), аповесць (паглыбленне паняцця). Эпізод, сюжэт, кампазіцыя ў эпічным творы (паглыбленне паняццяў). Апавядальнік у творы.

Мастацтва. Тэатральнае мастацтва: спектакль «Вераб’іная ноч» (Драматычны тэатр Беларускай Арміі, рэжысёр М.Дударава). Кінамастацтва: тэлефільм «Доўгія вёрсты вайны» (фільм 1. «Жураўліны крык») (рэжысёр А.Карпаў).

## ЛІРА-ЭПІЧНЫЯ ЖАНРЫ (6 гадзін)

Янка Купала. «Магіла льва». Зварот да гістарычнага мінулага. Паэтычнае асэнсаванне народнай легенды. Рамантызаваныя вобразы Натанькі і Машэкі. Вастрыня драматычнага канфлікту. Пафас лірыка-філасофскіх адступленняў. Гуманістычна-патрыятычны змест паэмы, асаблівасці яе кампазіцыі.

Аркадзь Куляшоў. «Маці». Адлюстраванне трагізму падзей Вялікай

Айчыннай вайны ў баладзе. Бязмежная самаахвярнасць маці. Фальклорныя вытокі сюжэта твора, сродкаў раскрыцця вобраза маці. Выкарыстанне народна-паэтычнай вобразнасці (зваротаў, тропаў, рытмікі).

Кандрат Крапіва. «Дыпламаваны Баран».

Анатоль Зэкаў. «Паўлін і Певень».

Крытыка чалавечых заган і недахопаў: невуцтва, ганарыстасці, фанабэрлівасці, агрэсіўнасці. Прыёмы і сродкі стварэння камічных сітуацый. Народная мудрасць, гумар у байках. Блізкасць мовы твораў да гутарковай. Мараль у байках як выяўленне аўтарскай пазіцыі.

Тэорыя літаратуры. Ліра-эпічныя літаратурныя жанры. Паэма: жанравыя асаблівасці, лірычныя адступленні. Літаратурная балада (паглыбленне паняцця). Байка: жанравыя асаблівасці (паглыбленне паняцця).

Мастацтва. Жывапіс: ілюстрацыі беларускіх мастакоў да паэмы Янкі Купалы «Магіла льва». Музыка: І.Лучанок. «Балада аб маці» (словы А.Куляшова). Скульптура: манумент у гонар савецкай маці-патрыёткі А.Ф.Купрыянавай (скульптары А.Заспіцкі, І.Місько, М.Рыжанкоў, архітэктар А.Трафімчук).

## ДРАМАТЫЧНЫЯ ЖАНРЫ (4 гадзіны)

Янка Купала. «Паўлінка». Жанравая адметнасць п’есы. Канфлікт новага і старога пакаленняў засцянковай шляхты ў камедыі. Вобраз Паўлінкі. Высмейванне шляхецкай пыхлівасці і духоўнай абмежаванасці. Камічнае і драматычнае ў вобразе Адольфа Быкоўскага. Самабытнасць камедыйных характараў Сцяпана Крыніцкага і Пранціся Пустарэвіча. Майстэрства аўтара ў абмалёўцы персанажаў, індывідуалізацыя іх мовы. Сцэнічнае ўвасабленне камедыі.

Тэорыя літаратуры. Драма як літаратурны род (пачатковае паняцце). Драматычныя жанры: трагедыя, драма, камедыя. Канфлікт, сцэна, карціна, рэпліка, рэмарка.

Мастацтва. Тэатральнае мастацтва: тэатральныя і тэлевізійныя спектаклі па п’есе Янкі Купалы «Паўлінка» (на выбар педагагічнага работніка, з улікам канкрэтных магчымасцей).

Паўтарэнне і падагульненне вывучанага за год (1 гадзіна).

## Спіс твораў для завучвання на памяць і мастацкага расказвання

Рыгор Барадулін. «Трэба дома бываць часцей».

Янка Купала. «Спадчына».

Максім Багдановіч. «Раманс» («Зорка Венера»).

Уладзімір Караткевіч. «Паром на бурнай рацэ» (урывак са слоў «Рака

шалела...», заканчваючы словамі «...два ці тры зеленаватыя яблыкі»).

Кандрат Крапіва. «Дыпламаваны Баран».

Спіс твораў для дадатковага чытання

Вячаслаў Адамчык. «Дзікі голуб».

Раіса Баравікова. «Казімір – сын Ягайлы + Насця з 8 «Б».

Васіль Быкаў. «Страта».

Віталь Вольскі. «Несцерка».

Аляксей Дудараў. «Кім».

Віктар Карамазаў. «Прыліпала».

Уладзімір Караткевіч. «Лісце каштанаў».

Уладзімір Ліпскі. «Споведзь сына».

Ніна Мацяш. Зборнік «Душою з небам гаварыць».

Міхась Пазнякоў. «Хлеб для партызанаў».

Іван Пташнікаў. «Львы».

Уладзімір Саламаха «Жыць тры дні».

Алег Салтук. Зборнік «На далонях жыцця».

Міхась Стральцоў. «Адзін лапаць, адзін чунь».

Іван Чыгрынаў. «Бульба».

Фрыдрых Шылер. Балада «Кубак».

Уільям Шэкспір. Санеты (у перакладзе У.Дубоўкі; 2–3 на выбар педагагічнага работніка).

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў VIII класа

Ведаць:

аўтараў, назвы і змест праграмных твораў;

выяўленчыя сродкі мастацкай выразнасці мовы;

звесткі па тэорыі літаратуры, неабходныя для аналізу мастацкага твора;

творы для завучвання на памяць;

умець:

узнаўляць мастацкія карціны, створаныя пісьменнікам;

вызначаць эмацыянальную танальнасць, настраёвасць мастацкага твора, яго эстэтычны пафас;

падрабязна, сцісла або выбарачна пераказваць (вусна і пісьмова) невялікі эпічны твор або ўрывак з эпічнага твора;

вылучаць эпізоды або дэталі, важныя для характарыстыкі дзейных асоб, устанаўліваць прычынна-выніковую сувязь паміж падзеямі і паводзінамі герояў у творы, разумець падтэкст;

характарызаваць героя мастацкага твора па яго ўчынках, паводзінах, перажываннях;

вызначаць элементы сюжэта і кампазіцыі вывучаных эпічных, ліра-эпічных і драматычных твораў;

знаходзіць выяўленчыя сродкі мовы і вызначаць іх ролю ў стварэнні вобраза, раскрыцці тэмы твора;

выяўляць аўтарскую пазіцыю;

выразна, у патрэбным тэмпе чытаць уголас літаратурны твор з улікам родавых, жанравых і стылявых адметнасцей, выяўляючы аўтарскую пазіцыю і свае адносіны да адлюстраванага;

складаць план празаічнага твора ці асобных яго раздзелаў;

рыхтаваць вуснае і пісьмовае сачыненне-разважанне (разгорнуты адказ, адказ на пытанне і паведамленне пра героя), апісваць свае назіранні і ўражанні ад падзей і з’яў жыцця;

даваць водгук на самастойна прачытаны літаратурны твор і творы іншых відаў мастацтва, выказваючы свае адносіны да герояў і падзей;

карыстацца даведачным апаратам вучэбнага дапаможніка і іншымі даведачнымі крыніцамі;

супастаўляць блізкія па тэме творы розных мастацкіх сістэм (паэзіі, прозы), родаў і жанраў, вызначаць іх асаблівасці ў паказе жыцця;

даваць разгорнуты адказ на пытанне, ставіць пытанні да літаратурнага твора;

валодаць:

навыкамі абагульнення, сістэматызацыі і супастаўлення вывучанага, выяўлення адметных рыс характару герояў, тыповага ў іх паводзінах, стаўленні да жыцця;

уменнямі і навыкамі вуснага і пісьмовага маўлення, лагічнага выказвання думак, дастатковым запасам маўленчых сродкаў;

навыкамі параўнання літаратурных твораў з творамі жывапісу, музыкі і іншых відаў мастацтва;

рознымі відамі літаратурна-творчай дзейнасці (напісанне сачынення, даклада, рэферата, водгуку, рэцэнзіі);

навыкамі работы з навукова-крытычнай і даведачнай літаратурай па пэўнай тэме (слоўнікі, даведнікі, энцыклапедыі, інтэрнэт-рэсурсы).

## IX клас

Усяго 51 гадзіна:

на вывучэнне твораў – 43 гадзіны;

на навучальныя сачыненні – 3 гадзіны;

на кантрольнае сачыненне – 2 гадзіны;

на ўрокі па творах для дадатковага чытання – 2 гадзіны;

рэзерв вучэбнага часу – 1 гадзіна.

## УВОДЗІНЫ (1 гадзіна)

Літаратура як мастацтва слова. Функцыі мастацкай літаратуры.

## ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА. ПОСТАЦІ АЙЧЫННАЙ ГІСТОРЫІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ (5 гадзін)

«Жыціе Ефрасінні Полацкай» (1 гадзіна). Адлюстраванне ў творы жыцця і дзейнасці асветніцы. Духоўны подзвіг Ефрасінні Полацкай. Рэальныя і гістарычныя факты ў творы. Адметнасць кампазіцыі «Жыція Ефрасінні Полацкай».

Тэорыя літаратуры. Жанр жыція (пачатковае паняцце).

Беларускі летапіс («Летапісец вялікіх князёў літоўскіх», «Беларуска-літоўскі летапіс (1446)» – урывак «Пахвала вялікаму князю Вітаўту») (1 гадзіна). Беларускія летапісы як вытокі мастацкай прозы. Адлюстраванне гістарычнага мінулага ў летапісных творах, іх патрыятычны пафас. Услаўленне мужнасці, міжнароднага аўтарытэту князя Вітаўта, яго гераічных подзвігаў у старажытным беларускім летапісе.

Тэорыя літаратуры. Жанр летапісу (пачатковае паняцце).

Мастацтва. Архітэктура: Сафійскі сабор у Кіеве (XI ст.); Сафійскі сабор у Ноўгарадзе (XII ст.); Сафійскі сабор у Полацку (XII ст.); Каложская царква ў Гродне (XII ст.). Жывапіс: А.Кашкурэвіч. «Еўфрасіння Полацкая – асветніца»; П.Сергіевіч. «Усяслаў Полацкі»; Г.Вашчанка. «Грунвальдская бітва»; М.Басалыга. «Вялікі князь Вітаўт». Музыка: А. Мдывані. Балет «Страсці» (паст. В.Елізар’ева).

Францыск Скарына. Прадмова да кнігі «Юдзіф» (урывак) (1 гадзіна). Звесткі пра першадрукара і асветніка-гуманіста. Агульначалавечы змест прадмовы. Сцвярджэнне ідэі патрыятызму, грамадзянскага абавязку. Значэнне дзейнасці Ф. Скарыны.

Тэорыя літаратуры. Жанр прадмовы (пачатковае паняцце).

Мікола Гусоўскі. Паэма «Песня пра зубра» (2 гадзіны). Мікола Гусоўскі – паэт-гуманіст. «Песня пра зубра» як выдатны твор старажытнай беларускай літаратуры. Жанр, сюжэт і кампазіцыя паэмы. Тэма Радзімы ў творы. Сімвалічнае значэнне вобраза зубра. Вобраз князя Вітаўта, высокая аўтарская ацэнка дзейнасці князя.

Мастацтва. Скульптура: А.Дранец. «Францыск Скарына»; У.Панцялееў. Помнік М.Гусоўскаму ў Мінску. Жывапіс: Я.Драздовіч. «Францыск Скарына», «Друкарня Францыска Скарыны ў Вільні»; В. Барабанцаў. «Мікола Гусоўскі»; М.Басалыга. «Мікола Гусоўскі»; А.Кашкурэвіч. Ілюстрацыі да паэмы «Песня пра зубра»; Я.Кулік. Ілюстрацыі да паэмы «Песня пра зубра». Музыка: Д.Смольскі. Опера «Францыск Скарына». Кінамастацтва: «Песня пра зубра» (рэжысёр

Э.Перагуд).

## РАМАНТЫЧНАЕ І РЭАЛІСТЫЧНАЕ АДЛЮСТРАВАННЕ ЖЫЦЦЯ Ў МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ (8 гадзін)

Ян Баршчэўскі. Апавяданні «Шляхціц Завальня», «Плачка», «Белая Сарока» (са зборніка «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях») (2 гадзіны). Звесткі пра пісьменніка. Галоўны літаратурны твор пісьменніка «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» – зборнік фантастычных апавяданняў. Цесная сувязь кнігі з беларускай міфалогіяй і фальклорам. Выяўленне асаблівасцей светапогляду беларусаў. Хараство духоўнага свету чалавека, які трымаецца векавых традыцый, звычаяў. Роля вобраза Завальні ў творы. Рамантычныя сюжэты і вобразнасць. Сімволіка вобразаў.

Тэорыя літаратуры. Рамантычны герой (пачатковае паняцце).

Адам Міцкевіч. Балада «Свіцязянка» (1 гадзіна). Звесткі пра пісьменніка. А.Міцкевіч і Беларусь. Паэтычнае асэнсаванне беларускага фальклору і міфалогіі ў баладзе. Рамантычнае вырашэнне тэмы кахання ў творы.

Мастацтва. Скульптура: А.Заспіцкі, А.Фінскі. Помнік Адаму Міцкевічу ў Мінску. Жывапіс: В.Ваньковіч. «Партрэт Адама Міцкевіча», «Міцкевіч на скале Аю-Даг»; С.Герус. «Адам Міцкевіч»; У.Пракапцоў. «А.Міцкевіч. Боль паэта»; К.Альхімовіч. «Свіцязянка»; У.Пасюкевіч. «Свіцязянская балада. Паэт А.Міцкевіч»; малюнкі Н.Орды «Сядзіба Міцкевічаў у Завоссі», «Туганавічы».

Канстанцін Вераніцын. Паэма «Тарас на Парнасе» (1 гадзіна). Аўтарства і час напісання паэмы. Сатырычны і гумарыстычны пафас твора. Сцвярджэнне ідэй народнасці ў літаратуры. Роля міфалагічных персанажаў у раскрыцці тэмы і ідэі твора. Тарас як тыповы народны герой, рысы яго характару: кемлівасць, абачлівасць, дасціпнасць. Выяўленчае майстэрства аўтара ў абмалёўцы персанажаў.

Тэорыя літаратуры. Пародыя і бурлеск у літаратуры (пачатковае паняцце).

Мастацтва. Скульптура: літаратурна-мастацкая кампазіцыя «Канстанцін Вераніцын і яго паэма «Тарас на Парнасе» ў Гарадку (Віцебская вобласць). Жывапіс: «Канстанцін Вераніцын» (малюнак С.Харэўскага); ілюстрацыі да паэмы «Тарас на Парнасе» (мастакі У.Гладкевіч, Н.Гуціеў, В.Славук). Тэатральнае мастацтва: спектакль «Тарас на Парнасе» (Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача, рэжысёр Н.Башава).

Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. Фарс-вадэвіль «Пінская шляхта» (2 гадзіны). Звесткі пра пісьменніка. Жанравае вызначэнне, сатырычны і

гумарыстычны пафас твора. Выкрыццё царскага чыноўніцтва. Вобраз Кручкова, яго тыповасць. Вобразы засцянковай шляхты. Праблема бацькоў і дзяцей. Майстэрства драматурга ў разгортванні інтрыгі, сюжэта, у стварэнні камічнага эфекту. Гратэск і шарж як прыёмы фарса-вадэвіля.

Тэорыя літаратуры. Фарс і вадэвіль як камедыйныя жанры (пачатковае паняцце).

Мастацтва. Скульптура: Л.Гумілеўскі, С.Гумілеўскі. Помнік В.Дуніну-Марцінкевічу і С.Манюшку ў Мінску; М.Якавенка. Помнік В.Дуніну-Марцінкевічу ў Тупальшчыне (Валожынскі раён); В.Янушкевіч. «В.Дунін-Марцінкевіч» (гіпс). Жывапіс: У.Тоўсцік. «Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч – драматург»; І.Рэй. «В.Дунін-Марцінкевіч з дочкамі Камілай і Цэзарынай»; Я.Ціхановіч. «Партрэт Вінцука Дуніна-Марцінкевіча». Музыка: У.Кандрусевіч. Мюзікл «Залёты» (паводле В.Дуніна-Марцінкевіча); І.Лучанок. Цыкл для голасу з суправаджэннем «О, Радзіма бацькоў». Тэатральнае мастацтва: спектакль «Пінская шляхта» (Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы, рэжысёр М.Пінігін).

Францішак Багушэвіч. Прадмова да зборніка «Дудка беларуская»; вершы «Мая дудка», «Хмаркі» (2 гадзіны). Звесткі пра пісьменніка. Ідэйны змест прадмовы да зборніка «Дудка беларуская». Пошукі асноў духоўнага і гістарычнага адраджэння народа. Аўтарскі погляд на ролю паэта і паэзіі ў вершы «Мая дудка». Паэтычнае асэнсаванне ўласнага лёсу ў алегарычным вершы «Хмаркі».

Мастацтва. Скульптура: Л.Гумілеўскі, С.Гумілеўскі. Помнік Ф.Багушэвічу ў Смаргоні. Жывапіс: Я.Ціхановіч. «Партрэт Францішка Багушэвіча».

## НАЦЫЯНАЛЬНАЕ І АГУЛЬНАЧАЛАВЕЧАЕ Ў МАСТАЦТВЕ СЛОВА (14 гадзін)

Янка Купала. Вершы «А хто там ідзе?», «Мая малітва» («Я буду маліцца і сэрцам, і думамі...»), «Жняя», «Явар і каліна», «Роднае слова» («Магутнае слова, ты, роднае слова!..»); паэма «Бандароўна» (5 гадзін). Звесткі пра пісьменніка. Лірыка. Асэнсаванне гістарычнага лёсу беларускага народа. Агульначалавечыя матывы ў вершах. Ідэя вечнасці жыцця, кахання, гармонія чалавека і прыроды. Жанравае, вобразнае, інтанацыйнае багацце лірыкі.

«Бандароўна». Фальклорная першакрыніца паэмы. Рамантычная аснова твора. Сутнасць канфлікту. Вобразы-антыподы. Драматызм дзеяння. Маральнае хараство Бандароўны.

Тэорыя літаратуры. Віды, жанры лірыкі (паглыбленне паняцця).

Мастацтва. Скульптура: З.Азгур. Помнік Янку Купалу ў Вязынцы (Мінская вобласць); А.Анікейчык. Помнік Янку Купалу ў Нью-Ёрку (Араў-

парк); помнік Янку Купалу ў Мінску (скульптары А.Анікейчык, Л.Гумілеўскі, А.Заспіцкі, архітэктары Ю.Градаў, Л.Левін). Жывапіс: В. Шаранговіч. «А хто там ідзе?»; П.Сергіевіч. «А хто там ідзе?»; М.Савіцкі. «Янка Купала»; А.Кашкурэвіч. Ілюстрацыі да паэмы «Бандароўна»; М.Басалыга. Ілюстрацыі да паэмы «Бандароўна». Музыка: Ю.Семяняка. «Явар і каліна»; песні і рамансы на словы паэта (кампазітары У.Алоўнікаў, А.Багатыроў, В.Войцік, Д.Камінскі, С.Картэс, В.Кузняцоў, М.Літвін, І.Лучанок, А.Мдывані, Л.Мурашка, Д.Смольскі, У.Солтан, А.Чыркун); Творы па беларускай літаратуры для завучвання на памяць (паэмы, вершы, проза, песні): мастацкае электроннае выданне на 2 кампакт-дысках. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2006–2007.

Якуб Колас. Вершы «Не бядуй!», «Родныя вобразы», «Першы гром», паэма «Новая зямля» (6 гадзін). Звесткі пра пісьменніка. Лірыка. Элегічнае і аптымістычнае ў паэзіі Якуба Коласа («Не бядуй!»). Паэтызацыя роднай прыроды («Родныя вобразы», «Першы гром»). Рытміка-інтанацыйны лад вершаў Якуба Коласа. «Новая зямля» – мастацкая энцыклапедыя народнага жыцця. Аўтабіяграфічнасць паэмы, яе творчая гісторыя. Жанравыя асаблівасці твора. Народны побыт і прырода ў паэме. Вобразы ў паэме: мудрасць і душэўная прыгажосць Антося, Ганны; вобразы дзяцей. Трагедыя лёсу Міхала. Філасофская ідэя зямлі і волі. Сімвалічны сэнс назвы твора. Паэтычнае майстэрства Якуба Коласа.

Тэорыя літаратуры. Паэма як жанр (паглыбленне паняцця).

Мастацтва. Скульптура: З.Азгур. Помнік Якубу Коласу (архітэктары Ю.Градаў, Л.Левін); мастацка-мемарыяльны комплекс «Шлях Коласа». Жывапіс: У. Стальмашонак. «Партрэт Якуба Коласа»; А.Волкаў. «Настаўніцкі з’езд 1906 года»; В. Шаранговіч. Ілюстрацыі да паэмы «Новая зямля»; С.Герус. «Якуб Колас. Новая зямля»; У.Сулкоўскі. Серыя палотнаў «Радзіма Якуба Коласа». Музыка: У.Алоўнікаў. «Дуб», «Глуха шэпча лес», «Мой родны кут»; Л.Захлеўны. «На новай зямлі»; Ю.Семяняка. «Добра ў лузе ў час палудны...»; Ю.Семяняка. Опера «Новая зямля» (лібрэта А.Петрашкевіча). Тэатральнае мастацтва: спектакль «Міхалава зямля» (Беларускі дзяржаўны тэатр юнага гледача, рэжысёр У.Савіцкі).

Максім Багдановіч. Вершы «Санет» («Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...»), «Маладыя гады», «Жывеш не вечна, чалавек...», «Плакала лета, зямлю пакідаючы...» (2 гадзіны). Звесткі пра паэта. Нацыянальныя і агульначалавечыя матывы ў паэзіі М.Багдановіча. Багацце духоўнага свету лірычнага героя. Пошукі гармоніі, услаўленне красы жыцця і мастацтва. Рытмічнае багацце і мілагучнасць верша.

Тэорыя літаратуры. Санет (паглыбленне паняцця).

Мастацтва. Скульптура: С.Вакар. Помнік М.Багдановічу. Жывапіс: Г.Вашчанка. «М.Багдановіч»; В.Волкаў. «М.Багдановіч»; У.Новак. «М.Багдановіч у Ялце»; У.Пасюкевіч. «“У краіне светлай...”

(М.Багдановіч)»; В.Шматаў. «Партрэт Максіма Багдановіча». Музыка: Г.Гарэлава. Вакальны цыкл «Дзявочыя песні»; І.Лучанок. «Вераніка»; Ю.Семяняка. Опера «Зорка Венера»; Я.Тарасевіч. «Асенняя песня (Плакала лета)»; Л.Шлег. Вакальны цыкл «Вянок»; песні і рамансы на словы паэта (кампазітары Л.Абіліёвіч, М.Аладаў, А.Багатыроў, У.Мулявін, І.Палівода, А.Туранкоў, Э.Тырманд).

Максім Гарэцкі. Апавяданне «Роднае карэнне» (1 гадзіна). Звесткі пра пісьменніка. «Роднае карэнне». Тэма вернасці роднай зямлі, служэння інтэлігенцыі народу. Вобраз Архіпа Лінкевіча – вясковага інтэлігента з абуджаным сумленнем, пачуццём абавязку перад людзьмі, які імкнецца пазнаць жыццё, знайсці «першапрычыну ўсякае істоты». Жыццёвая мудрасць дзеда Яхіма, яго запавет маладому пакаленню.

Тэорыя літаратуры. Вобраз апавядальніка (паглыбленне паняцця).

Мастацтва. Скульптура: Э.Астаф’еў. Рэльефны партрэт М.Гарэцкага для мемарыяльнай дошкі. Жывапіс: А.Крывенка. «Максім Гарэцкі». Тэатральнае мастацтва: спектакль «Атрута» (рэжысёр М.Стрыжоў).

## ЧАЛАВЕК У ЧАСЕ І ПРАСТОРЫ Ў ТВОРАХ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ (14 гадзін)

Кузьма Чорны. Апавяданне «На пыльнай дарозе» (1 гадзіна). Звесткі пра пісьменніка. Мастацкае ўвасабленне аўтарскай формулы «Чалавек – гэта цэлы свет». Майстэрства пісьменніка ў раскрыцці ўнутранага свету герояў. Гуманістычны і жыццесцвярджальны пафас апавядання. Сімвалічны сэнс вобраза дарогі.

Тэорыя літаратуры. Псіхалагізм у літаратуры (пачатковае паняцце).

Мастацтва. Скульптура: З.Азгур. «Пісьменнік Кузьма Чорны». Жывапіс: І.Ахрэмчык. «Партрэт К.Чорнага»; Х.Ліўшыц. «Янка Купала і Кузьма Чорны ў Пячышчах у 1942 годзе».

Аркадзь Куляшоў. Вершы «Мая Бесядзь», «Спакойнага шчасця не зычу нікому...», «На паўмільярдным кіламетры», «Нябёсы – акіян, я знаў даўно...» (2 гадзіны). Звесткі пра паэта. Грамадзянская, маральна-этычная і філасофская тэматыка вершаў. Раскрыццё агульначалавечага праз глыбока асабістае. Услаўленне чалавека, яго духоўных каштоўнасцей, бязмежнасці пазнання сябе і свету. Паэтычнае майстэрства А.Куляшова.

Мастацтва. Жывапіс: У.Кожух. «Новая дарога»; М.Рагалевіч. «Беларуская калыханка»; А.Бараноўскі. «Пара залатых бяроз»; Г.Вашчанка. «Крылы»; Я.Драздовіч. «Космас», «Артаполіс», «Трывеж», «Панарама месячнага горада», «Падкружніковы краявід на планеце Сатурн». Выяўленчае мастацтва: Л.Талбузін. Медаль «Аркадзь Куляшоў». Музыка: Э.Наско. Вакальная музыка «Рамансы на вершы А.Куляшова».

Максім Танк. Вершы «Мой хлеб надзённы», «Завушніцы», «Ты яшчэ

толькі намёк на чалавека...», «Не знаю...» (2 гадзіны). Звесткі пра паэта. Тэмы і вобразы паэзіі Максіма Танка. Філасофскі роздум пра чалавека, яго жыццёвае прызначэнне. Увага да духоўнага свету чалавека, агульначалавечых каштоўнасцей. Шматграннасць паэтыкі.

Тэорыя літаратуры. Рытм і рыфма (паглыбленне паняцця).

Мастацтва. Скульптура: І.Міско, А.Фінскі. Помнік Максіму Танку ў Мядзелі. Жывапіс: Г.Гарэлаў. «Партрэт Максіма Танка»; С.Вярсоцкі. «Возера Нарач»; С.Герус. «Партрэт М.Танка»; Я.Зайцаў. «Партрэт М.Танка»; Н.Шчасная. «Партрэт М.Танка». Музыка: У.Мулявін. Раманс «Завушніцы»; Д.Смольскі. Раманс «Быць чалавекам я рад»; Ю.Талеснік. Раманс «Завушніцы»; Э.Тырманд. Рамансы «Мой хлеб надзённы», «Сасна», «Ва ўсім, вядома, вінават».

Іван Шамякін. Аповесць «Непаўторная вясна» (1-я кніга пенталогіі «Трывожнае шчасце») (3 гадзіны). Звесткі пра пісьменніка. Адлюстраванне даваеннага жыцця моладзі ў аповесці «Непаўторная вясна». Духоўны свет Пятра і Сашы, іх узаемаадносіны. Паэзія кахання і прыгожых чалавечых пачуццяў. Маральна-этычная праблематыка аповесці. Эмацыянальна-псіхалагічная змястоўнасць твора. Лірычны характар аўтарскага пісьма.

Мастацтва. Жывапіс: Н.Шчасная. «У снежныя зімы. Партрэт пісьменніка І.П.Шамякіна». Тэатральнае мастацтва: спектакль «Трывожнае шчасце».

Янка Брыль. Апавяданне «Memento mori» (1 гадзіна). Звесткі пра пісьменніка. Паказ вайны ў апавяданні. Маральны подзвіг старога селяніна ў творы. Уменне аўтара бачыць гераічнае за рамкамі бытавых сцэн. Асуджэнне фашызму ў апавяданні. Глыбокае разуменне народнага гераізму. Урачыстая танальнасць аўтарскага пісьма.

Мастацтва. Скульптура: С.Вакар. «Пісьменнік Я.Брыль». Жывапіс: У.Тоўсцік. «Янка Брыль»; В.Грамыка. «Партрэт Я. Брыля».

Уладзімір Караткевіч. Аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха» (3 гадзіны). Звесткі пра пісьменніка. Гістарычная аснова твора. Каларыт, атмасфера мінулай эпохі (80-я гады XIX ст.). Роздум аб прызначэнні чалавека на зямлі, лёсе беларускага народа, узаемасувязі розных гістарычных эпох. Праблемы дабра і зла, кахання, мужнасці і гераізму. Вобразы Андрэя Беларэцкага, Андрэя Свеціловіча і Надзеі Яноўскай. Асаблівасці кампазіцыі твора.

Тэорыя літаратуры. Жанр аповесці (паглыбленне паняцця).

Мастацтва. Скульптура: І.Голубеў. Помнік У.Караткевічу ў Оршы (Віцебская вобласць). Жывапіс: У.Батура. «Уладзімір Караткевіч»; У.Тоўсцік. «Памяці Караткевіча»; У.Зінкевіч. «Партрэт У.Караткевіча»; М.Будавей. «Партрэт У.Караткевіча»; ілюстрацыі да аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха» М.Басалыгі, А.Кашкурэвіча, Ю.Якавенкі. Музыка: У.Солтан. Опера «Дзікае паляванне караля Стаха». Кіна- і

тэлемастацтва: «Дзікае паляванне караля Стаха» (рэжысёр В.Рубінчык); «Памяць каменя» (сцэнарыст У.Караткевіч); «Сведкі вечнасці» (сцэнарыст У.Караткевіч); «Чорны замак Альшанскі» (рэжысёр М.Пташук).

Яўгенія Янішчыц. Вершы «Ты пакліч мяне. Пазаві...», «Чаму ніколі не баюся я...», «Не воблака, а проста аблачынка...», «Любоў мая...» (2 гадзіны). Звесткі пра паэтэсу. Тэматычная палітра паэзіі Яўгеніі Янішчыц: малая радзіма, казачная палеская прырода, вясковы і гарадскі побыт, лірыка кахання. Разнастайнасць пафасу ў творах: ад мажорнага, радаснага, да сумнага, трывожнага.

Мастацтва. Жывапіс: В.Масцераў. «Яўгенія Янішчыц»; А.Лось. «Паэтэса Яўгенія Янішчыц»; Г.Вашчанка. «Маё Палессе». Музыка: песні і рамансы на словы паэтэсы (кампазітары Ю.Семяняка, Р. Давыдаў, М.Юрко і іншыя кампазітары).

Паўтарэнне і падагульненне вывучанага за год (1 гадзіна).

Спіс твораў для завучвання на памяць

Янка Купала. «Явар і каліна».

Якуб Колас. «Леснікова пасада» (з паэмы «Новая зямля») – урывак (са слоў «Мой родны кут, як ты мне мілы!..», заканчваючы словамі «Ка мне, вясна ты маладая!..»).

Максім Танк. «Ты яшчэ толькі намёк на чалавека...».

Яўгенія Янішчыц. «Ты пакліч мяне. Пазаві...».

Спіс твораў для дадатковага чытання

«Аповесць пра Грунвальдскую бітву» (урывак з «Хронікі Быхаўца») (пераклад В.Чамярыцкага).

Бачу Беларусь такой: фотаальбом (вершы з кнігі).

Уладзімір Караткевіч. «Чазенія».

Васіль Быкаў. «Альпійская балада».

Генры Лангфела. «Спеў аб Гаяваце» (пераклад А.Куляшова).

Максім Лужанін. «Колас расказвае пра сябе».

Мікола Маляўка. Зборнік «Старая зямля».

Алесь Марціновіч. «Гістарычныя постаці».

Іван Саверчанка. «Скарб крывічоў: легенда».

Мігель дэ Сервантэс. «Хітры гідальга Дон Кіхот Ламанчскі».

Вальтэр Скот. «Айвенга».

Анатоль Статкевіч-Чабаганаў. «Лёс роду – лёс радзімы».

Міхась Стральцоў. «Загадка Багдановіча».

Алена Стэльмах. «Дуб і крумкач».

Мікола Шабовіч. Зборнік «Мая надзея» (вершы з раздзелаў

«Верлібры», «Санеты»).

Віктар Шніп. Зборнік «Балада камянёў».

Яўгенія Янішчыц. Зборнік «Пачынаецца ўсё з любві...», «Зорная паэма».

## Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў IX класа

Ведаць:

аўтараў, назвы і змест праграмных твораў;

этапы развіцця беларускай літаратуры;

асноўныя эпохі і напрамкі развіцця літаратуры;

асноўныя звесткі пра жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў;

выяўленчыя сродкі мастацкай выразнасці мовы;

звесткі па тэорыі літаратуры, неабходныя для аналізу мастацкага твора;

творы для завучвання на памяць;

умець:

выразна, у патрэбным тэмпе чытаць уголас літаратурны твор з улікам родавых, жанравых і стылявых адметнасцей на аснове самастойнай інтэрпрэтацыі аўтарскай пазіцыі;

вызначаць тэматыку, праблематыку літаратурнага твора;

характарызаваць літаратурнага героя;

аналізаваць прыёмы раскрыцця характару ў мастацкім творы;

выяўляць аўтарскую пазіцыю;

выяўляць асноўныя адметнасці стылю (творчай індывідуальнасці) пісьменніка;

аналізаваць і інтэрпрэтаваць мастацкі твор, выкарыстоўваючы звесткі па гісторыі і тэорыі літаратуры;

самастойна ацэньваць вывучаныя творы з улікам іх мастацкай спецыфікі і абгрунтоўваць гэту ацэнку;

суадносіць мастацкую літаратуру з грамадскім і культурным жыццём, раскрываць канкрэтна-гістарычны і агульначалавечы змест вывучаных літаратурных твораў;

весці дыялог па прачытаных творах, улічваць чужы пункт гледжання на твор і аргументавана адстойваць сваё меркаванне;

рыхтаваць разгорнуты адказ на праблемнае пытанне;

даваць водгук на самастойна прачытаны літаратурны твор і на творы іншых відаў мастацтва, выказваючы свае адносіны да герояў і падзей;

самастойна пісаць сачыненне на прапанаваную тэму;

рыхтаваць паведамленне, рэферат і іншыя віды работ;

складаць план і канспект літаратурна-крытычнага артыкула;

карыстацца рознага роду даведачна-інфармацыйнымі крыніцамі;

валодаць:

навыкамі абагульнення, сістэматызацыі і супастаўлення вывучанага, выяўлення адметных рыс характару герояў, тыповага ў іх паводзінах, стаўленні да жыцця;

уменнямі і навыкамі вуснага і пісьмовага маўлення, лагічнага выказвання думак, дастатковым запасам маўленчых сродкаў;

навыкамі параўнання літаратурных твораў з творамі жывапісу, музыкі і іншых відаў мастацтва;

рознымі відамі літаратурна-творчай дзейнасці (напісанне сачынення, даклада, рэферата, водгуку, рэцэнзіі);

навыкамі работы з навукова-крытычнай і даведачнай літаратурай па пэўнай тэме (літаратурна-крытычныя артыкулы, слоўнікі, даведнікі, энцыклапедыі, інтэрнэт-рэсурсы).